*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

14 КАСТРЫЧНІКА 2008 г. АЎТОРАК
№ 194 (26307)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Прамая лінія**

## Як працістаяць сасудзістай паталогіі галаўнога мозга?

Аб гэтым можна распытаць **Арнольда Фёдаравіча СМЕЯНОВІЧА,** прафесара, загадчыка нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

***«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца сёння з 16.00 да 17.00.***

***Званіце па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.***

## У КАНСУЛЬТАЦЫЮ — БЕЗ ЧЭРГАЎ?

У Беларусі плануецца разгледзець пытанне аб ўстанаўленні Дня бацькі. У прыватнасці, паводле ацэнак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, цяпер у водпуску па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў у нашай краіне знаходзяцца 1,5-1,6 тыс. бацькаў.

Як адзначыла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шэметавец, у бліжэйшы час плануецца вывучыць прапановы аб больш адчувальным павелічэнні дапамог на дзяцей да 3 гадоў. Адначасова мяркуецца разгледзець магчымасць увядзення «мацярынскага капіталу», праўда, нават у выпадку прыняцця станоўчага рашэння «формула» гэтай падтрымкі сем'яў пры нараджэнні другога дзіцяці наўрад ці будзе адпавядаць расійскай.

У той жа час ёсць намер прадастаўляць водпуск «на роды», як у Расійскай Федэрацыі. Цяпер працягласць такога водпуску ў Расіі ў выпадку нармальных родаў складае 140, а ў выпадку ўскладненых родаў — 156 дзён, тады як у Беларусі — 126 і 140 дзён адпаведна. Паводле слоў Таццяны Шэметавец, у гэтым плане мы павінны «дагнаць» суседзяў, тым больш што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе аб здароўі дзяцей.

Між тым, паводле слоў галоўнага акушэра-гінеколага Міністэрства аховы здароўя Святланы Шылавай, медыцынская дапамога маці і дзецям стане больш сучаснай. Да 2010 года ва ўсіх жаночых кансультацыях нашай краіны павінны з'явіцца фітальныя маніторы для кантролю за цяжарнымі жанчынамі і апараты ўльтрагукавой дыягностыкі. Пры гэтым, дзякуючы павелічэнню набору ў медыцынскія навучальныя ўстановы, у тых жа жаночых кансультацыях знікне дэфіцыт акушэраў-гінеколагаў. Да прыкладу, сёння патрэба ў такіх спецыялістах па сталіцы задавальняецца на 70—72 працэнты, і вынікам гэтага становяцца чэргі на прыём.

**Сяргей ГРЫБ.**

Аўтарытэтна

## ГРОШЫ: РЭЗКІХ РУХАЎ ЛЕПШ НЕ РАБІЦЬ...

**Учора фондавыя таргі ў Еўропе адкрыліся значным павышэннем вядучых індэксаў: пазітыўны ўплыў на гэта, паводле меркавання экспертаў, аказалі вынікі экстранага саміта еўразоны і Вялікабрытаніі, які быў прысвечаны супрацьстаянню глабальнаму фінансаваму крызісу. Нагадаем, што цэнтральным пунктам стала прынцыповае рашэнне еўрагрупы забяспечыць дзяржаўныя гарантыі не толькі па прыватных банкаўскіх укладах, але і па міжбанкаўскіх крэдытах.**

Падтрымка еўрапейцамі сваёй фінансавай сферы, дарэчы, паўплывала і на рост акцый буйнейшых расійскіх банкаў (Ашчадбанка, ВТБ), якія ўчора ўмацоўваліся. Разам з тым, паводле паведамленняў інфармацыйных агенцтваў, толькі за верасень расійскія ўкладчыкі забралі з недзяржаўных банкаў 37 мільярдаў рублёў. Нягледзячы на тое, што банкіры ў данай сітуацыі не гавораць пра крызіс даверу да гэтых устаноў, трэба меркаваць, што адбываецца пераразмеркаванне ўкладаў на карысць дзяржаўных банкаў. Прынамсі, парады шматлікіх экспертаў аб неабходнасці перанесці дэпазіты ў дзяржаўныя банкі (калі размова заходзіць пра тое, як з найменшымі стратамі пержыць нарастаючы крызіс) там «рэкламуюцца» шырока апошнім часам.

Куды больш уражлівая навіна прыйшла з Украіны: спасылаючыся на газету «Камерсант—Украіна», інфармагенцтвы паведамляюць пра тое, што Нацбанк гэтай краіны забараніў банкам датэрмінова выдаваць дэпазіты насельніцтву. Пастанова Нацбанка Украіны заклікана ўтрымаць банкаўскую сістэму краіны ад краху, пасля таго як за тыдзень украінцы забралі ўкладаў на 3 мільярды долараў.

— У Беларусі такое немагчыма, — заўпэўнівае **начальнік упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль ДРАЗДОЎ,** каментуючы верагоднасць падобнага кроку з боку галоўнай фінансавай установы нашай краіны. — Па-першае, таму, што Нацыянальны банк не мае права выдаць такі нарматыўны дакумент. У нас ёсць Банкаўскі кодэкс, дзе дакладна прапісана: кожнаму грамадзяніну датэрмінова на працягу пяці дзён банкі абавязаны вярнуць уклад. Таму, Нацбанк не будзе нават спрабаваць гэта рабіць. А, па-другое, для падобных мераў няма падстаў — у нас сітуацыя спакойная.

***— Гэта значыць, нашым банкам крызіс даверу не пагражае?***

— Паводле апошняй інфармацыі, зафіксаваны чарговы рост дэпазітаў у беларускіх банках. Прычым як па ўкладах у нацыянальнай валюце назіраецца рост, так і па дэпазітах у замежнай валюце. У рэспубліцы зусім іншая сітуацыя, чым ва Украіне, дзе з пачатку года курс грыўні дэвальваваўся на 20 працэнтаў. Таму ў іх, сапраўды, назіраюцца «ўцёкі» ад грыўні. Ва Украіне людзі ў паніцы скупляюць валюту, каб абараніць свае зберажэнні: яны закрываюць свае рахункі ў банках і хуценька канвертуюць грошы. Што ж датычыцца Беларусі, то курс нашай нацыянальнай валюты ў адносінах да іншых умацоўваецца. І, дарэчы, на 1 кастрычніка станоўчае сальда гандлю наяўнай валюты з насельніцтвам склала ў эквіваленце 406 мільёнаў долараў ЗША. Такога не было ніколі.

***— Атрымліваецца, што насельніцтва па-ранейшаму робіць стаўку на беларускі рубель?***

— Так. На сённяшні дзень 66 працэнтаў укладаў у банках людзі трымаюць менавіта ў нацыянальнай валюце.

***— Прадказаць зараз далейшыя хістанні курсаў валют цяжка, тым не менш, на ваш погляд, у якой СКВ лепш за ўсё трымаць зберажэнні?***

— Нейкіх рэзкіх рухаў у такі перыяд лепш не рабіць: у чым ляжаць у вас грошы — у тым і трымайце. Атрымалі ў рублях — захоўвайце ў іх, дзесьці разжыліся валютай — прынцып той жа. Канешне, напрыклад, курс еўра долару апошнім часам істотна сaступіў, і калі летам вы за 1 еўра аддавалі 3300 рублёў, то абменьваць яго зараз — панесці страты. Аднак і тут праблем, на мой погляд, няма: аднясіце еўра ў банк і захоўвайце.

***— А мерныя залатыя злiткі як сродак зберажэння?..***

— Гледзячы з якой мэтай іх купляць. У плане кароткатэрміновай ліквіднасці няма сэнсу іх набываць. Як няма сэнсу і мяняць банкаўскі дэпазіт на мерны злітак: гэта на сто працэнтаў неразумная аперацыя.

***— У Расіі адобраны законапраект, згодна якому гарантаваная страхавая кампенсацыя па банкаўскіх укладах павялічылася да 700 тысяч расійскіх рублёў. У нас з пачатку наступнага года гарантуецца вяртанне 100 працэнтаў укладаў, незалежна ад валюты ўкладу, у любым банку на суму, якая эквівалентна 5 тысячам еўра ўключна. Тут не плануецца нейкія змены ў сувязі з апошнімі падзеямі?***

— Па першае, нешта змяніць тут не так проста — гэта закон. Па-другое, у нас няма такой сітуацыі, як у Расіі, няма такой катастрофы з банкаўскай ліквіднасцю, што назіраецца ў РФ, і назіраецца ўжо дастаткова доўгі перыяд. Таму Расія падстрахоўваецца і прымае гэты закон. Акрамя таго, 90 працэнтаў укладаў у Беларусі — менавіта дэпазіты да 5 тысяч еўра, а таму замацаваная ў законе сума аптымальная. У нас няма неабходнасці нешта мяняць — для гэтага адсутнічаюць прычыны: ёсць ліквіднасць, дэпазіты банкі прымаюць, крэдыты выдаюць, банкаўская сістэма працуе нармальна.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**




**Жыхарка пасёлка Азёрны Жыткавіцкага раёна Наталля ВОВК з дачкой Віялетай і сынам Стасам.**

## Дарагія жанчыны!

*Ад усёй душы віншую вас з Днём Маці.*

*У гэтым свеце няма нічога больш светлага і моцнага, чым мацярынская любоў. Менавіта яна і бясконцае цярпенне дапамагаюць вам развіваць у дзяцей лепшыя чалавечыя якасці — працавітасць, дабрыню, адданасць Радзіме.*

*Сённяшняе свята — гэта даніна павагі ўсім маці Беларусі, сведчанне прызнання вашай вялізнай ролі ва ўмацаванні сям'і, выхаванні юных грамадзян, захаванні духоўных і культурных традыцый нашага народа.*

*Мы ганарымся выдатнымі суайчынніцамі, якія з'яўляюцца не толькі цудоўнымі жонкамі і маці, але і добрымі спецыялістамі ў самых розных галінах, робяць усё магчымае дзеля дабрабыту і працвітання Беларусі.*

*Праводзімая ў краіне сацыяльная палітыка садзейнічае таму, каб жанчыны змаглі ажыццявіць сваё прызначэнне — выгадаваць і выхаваць здаровых і шчаслівых дзяцей. Аб'яўленыя па чарзе Год маці, Год дзіцяці, Год здароўя па зместу ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і даюць магчымасць планамерна рэалізоўваць дзяржаўныя праграмы па ахове мацярынства і дзяцінства, павышэнні статусу і прэстыжу ўзорнай сям'і, паляпшэнні дэмаграфічнай сітуацыі ў рэспубліцы.*

*Беларуская дзяржава і надалей будзе ствараць неабходныя ўмовы для паспяховай дзейнасці жанчын ва ўсіх сферах жыцця.*

*Няхай штодзённа родныя і блізкія людзі дораць вам, дарагія мамы, увагу, клопат і пяшчоту.*

*Моцнага вам здароўя, хатняй утульнасці, шчасця і любові.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### АПОШНЯЕ ПАЛЯВАННЕ

**З 5 кастрычніка родныя нічога не ведалі пра лёс 20-гадовага маладога чалавека, якога шукалі як зніклага без вестак: праваахоўнікам спатрэбілася няшмат часу, каб праліць святло на ўсе акалічнасці гэтага факта.**

У прыватнасці, у ходзе расследавання было ўстаноўлена, што няшчаснага 5 кастрычніка каля апоўдні паблізу вёскі Прудок Калінкавіцкага раёна ў лесе падчас палявання з зарэгістраванага ружжа ТОЗ застрэліў 21-гадовы рабочы. І паспрабаваў замесці сляды гэтага здарэння: ён расчляніў цела ахвяры і закапаў. Злачынца арыштаваны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, Ігар ГРЫШЫН.**

### КІРОЎЦА ЗНІК БЕЗ АЎТАМАБІЛЯ...

**На месцы дарожна-транспартнага здарэння ў Слоніме, у якім загінулі людзі, вадзіцель кінуў свой мікрааўтобус «Форд» і збег.**

Як высветлілася, кіраваў мікрааўтобусам 30-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар. А палове дзясятай вечара ён выехаў на сустрэчную паласу, па якой рухаўся скутар, — сутыкнення пазбегнуць не ўдалося. У выніку 27-гадовы рабочы таварыства і 20-гадовы непрацуючы (мясцовыя жыхары), якія рухаліся на скутары, загінулі на месцы здарэння.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ВІНОЎНІК ДТЗ — КОНЬ...

**У мінулую пятніцу конь, які раптоўна выйшаў на дарогу, справакаваў дарожна-транспартнае здарэнне.**

ДТЗ адбылося каля сямі гадзін вечара на дарозе паблізу вёскі Пагост Салігорскага раёна. 33-гадовы кіроўца «Фольксвагена», жыхар Любанскага раёна, не змог размінуцца з жывёлай, якая нечакана з'явілася перад аўтамабілем. У выніку здарэння мужчына загінуў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### НОВЫЯ ХУТКАСЦІ ІНТЭРНЭТУ

**Знешні інтэрнэт-шлюз Беларусі нядаўна зноў пашырыўся і дасягае зараз 5,2 Гбіт/с.**

— Мы рэгулярна пашыраем знешні інтэрнэт-шлюз, — каментуе падзею намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» па тэхнічных пытаннях Сяргей Сівадзедаў. — Найбольш запатрабаваны напрамак у беларускіх карыстальнікаў інтэрнэту — расійскі, таму павелічэнне магутнасці часцей за ўсё адбываецца менавіта тут. Раней сумарная прапускная здольнасць у расійскім напрамку складала 3,2 Гбіт/с. Разам з «Растэлекамам» было заменена абсталяванне і пашыраны шлюз, цяпер у напрамку расійскага сегмента арганізаваны паток прапускной здольнасцю 4 Гбіт/с. Гэта дазваляе павялічыць хуткасць праходжання трафіка і палепшыць якасць перадачы дадзеных. А ў напрамку іншых замежных рэсурсаў канал застаўся ранейшы — 1,2 Гбіт/с.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### НЕВЯДОМАЯ СКРЫПКА СТРАДЫВАРЫ, МАГЧЫМА, ЗАХОЎВАЕЦЦА Ў ВЯСКОВЫМ МУЗЕІ ШАРКОЎШЧЫНЫ

А менавіта ў вёсцы Гарадзец. Пра гэта паведаміла навуковы супрацоўнік аддзела Германавіцкага музея культуры і побыту Ларыса Мядзелец. На ўнутраным баку вечка старажытнай скрыпкі з парванымі струнамі маецца надпіс на лацінскай «Antonius Stradivarius» і дата «172...». У свой час мясцовай зямлёй валодалі вядомыя магнацкія роды Вялікага Княства Літоўскага — Сапегі, Жабы. Апошнім у іх шэрагу значыцца род Плятэраў...

**БЕЛТА.**

Зямельная пытанне

## Больш за палову садаводаў вырашылі не рэгістраваць свае зямельныя ўчасткі

**Згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 28 студзеня 2008 года № 50, сёлета ў тэрмін да 8 кастрычніка ўсе члены садаводчых таварыстваў павінны былі зарэгістраваць свае зямельныя ўчасткі.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, арганізацыям і грамадзянам для вядзення калектыўнага садаводства было прадастаўлена амаль 522 тысячы зямельных участкаў. Самая вялікая колькасць членаў садаводчых таварыстваў прыпадае на Мінскую вобласць, дзе на гэтыя мэты грамадзянам было прадастаўлена каля 187 тысяч зямельных участкаў.

На 7 кастрычніка членамі садаводчых таварыстваў было зарэгістравана 233 294 зямельныя ўчасткі. Разам з тым да гадзіны пік у тэрытарыяльныя арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю было пададзена каля 14 тысяч заяў аб рэгістрацыі зямельных участкаў, якія былі прадастаўлены па лініі калектыўнага садаводства. Такім чынам, да 8 кастрычніка грамадзяне нават не звярталіся па дзяржаўную рэгістрацыю ў дачыненні да 274 368 зямельных участкаў (каля 52,6 працэнта ад агульнай колькасці), што былі прадастаўлены для ажыццяўлення калектыўнага садаводства. Якім будзе далейшы лёс такой вялікай колькасці незарэгістраваных зямельных участкаў, нашай газеце ў Дзяржкамітэце па маёмасці не ўдакладнілі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### НЯЎСТОЙЛІВАЕ НАДВОР'Е ПЛЮС ДАЖДЖЫ

У аўторак — дажджы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. Уначы ў сераду месцамі невялікія дажджы, удзень без ападкаў. У чацвер кароткачасовыя дажджы будуць назірацца толькі па паўночным захадзе, а ў пятніцу — добрыя ападкі ўжо паўсюдна па краіне. Тэмпература паветра ўначы на працягу працоўнага тыдня ад 4 да 11 цяпла, удзень — 10—17 градусаў.

На выхадныя кароткачасовыя дажджы чакаюцца ў паўночнай палове тэрыторыі краіны, пахаладае. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 3 цяпла на поўначы да плюс 9 на поўдні краіны, удзень адпаведна ад 6 да 14 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ (ПОВТОРНО) ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества, расположенных в д. Гончары, Воложинского района: Лот № 1: здание столовой, об. пл. 686,9 кв.м. Начальная цена – 129 423 600 бел. руб. Лот № 2: здание столярного цеха, об. пл. 493,8 кв.м. Начальная цена – 73 902 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.08.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **28.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **27.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 114,00 |
| 1 еўра | 2 883,60 |
| 1 латвійскі лат | 4 066,56 |
| 1 літоўскі літ | 835,21 |
| 1 чэшская крона | 117,855 |
| 1 польскі злоты | 813,88 |
| 1 расійскі рубель | 80,96 |
| 1 украінская грыўня | 410,49 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,1111 |
| 10 UAH | 50,7012 |
| 1000 BYR | 12,3544 |
| EUR | 35,6051 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.10.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

**БПС-БАНК**

**С 15 октября 2008 г. ОАО «БПС-Банк» предлагает физическим лицам срочный банковский депозит в белорусских рублях и иностранной валюте (доллары США, евро)**

**«Оптимальный»**

**на следующих условиях:**

| | |
|---|---|
| Процентные ставки (годовых) | • белорусских рублях — **15 %**<br>• доллары США, евро — **10 %** |
| Срок хранения | • **6 месяцев** |
| Дополнительные взносы | • без ограничения суммы и периодичности внесения |
| Сумма первоначального взноса | • в белорусских рублях — **500 тысяч рублей**<br>• в иностранной валюте — **не ограничена** |
| Порядок начисления и выплаты процентов | • **ежемесячная** капитализация<br>• выплата за любое количество периодов начисления |
| Досрочное расторжение | • до 3-х месяцев — **ставка текущего счета физических лиц**<br>• свыше 3-х месяцев — **установленная ставка по депозиту** |
| Иные условия | • с правом заключения договора **на имя другого лица** |

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк» или по телефону — 148 (многоканальный).

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

Возврат и сохранность средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»*

**БЕЛАРУСБАНК**

*ул. Мясникова, 32, г. Минск, 220050.*
*Тел.: (017) 200 18 31. Факс: (017) 226 47 50.*
***Телекс: 252408 PION BY.***
*E-mail: info@belarusbank.by*
***Интернет: http://www.belarusbank.by***

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2008 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 423438,9 | 314548,2 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 998845,9 | 611307,1 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 1092365,2 | 942837,3 |
| | для торговли | 11031 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 7,4 | 12120,2 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 1092357,8 | 930717,1 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 1677974,9 | 960883,9 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 17271443,0 | 12033602,9 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 175114,3 | 101468,2 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 527758,2 | 442767,6 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 251699,0 | 124243,0 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 22418639,4 | 15531658,2 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 1414434,1 | 785186,5 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 2099888,5 | 1676728,0 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 15648335,4 | 10685405,9 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 539271,6 | 232537,5 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 242931,3 | 160009,4 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 19944860,9 | 13539867,3 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 1637544,2 | 1437530,9 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 109007,2 | 52773,1 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 493799,3 | 309547,6 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 233427,8 | 191939,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 2473778,5 | 1991790,9 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 22418639,4 | 15531658,2 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 41498792,0 | 30171985,9 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 4726036,7 | 3063762,7 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2008 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1305821,2 | 967928,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 887140,3 | 628219,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 418680,9 | 339709,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 314391,6 | 242260,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 42203,8 | 40137,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 272187,8 | 202122,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 161872,5 | 78773,4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 2628,7 | 595,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 566,9 | 482,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 30992,6 | 14833,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 42149,6 | 26888,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 561132,6 | 450209,5 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 69767,1 | 29887,3 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 52888,3 | 34506,3 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 183305,8 | 119134,7 |

**И.о. Председателя Правления** **Г.С. Господарик**

**Главный бухгалтер** **И.П. Лысоковская**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

ISSN 1990 - 763X

Здароўе нацыі

# У пошуку неўролага. І платнай неўралагічнай дапамогі


Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ

**Айчынныя неўралогія і нейрахірургія імкліва развіваюцца ў апошнія гады. Дастаткова сказаць, што ў галіне неўралогіі на новую вышыню ўзнімаецца дыягностыка, больш дакладнай становіцца статыстыка некаторых складаных захворванняў. Беларускія нейрахірургі пачалі выконваць шэраг малатраўматычных аперацый на галаўным мозгу. Аб тым, каму патрэбна кансультацыя неўролагаў, навошта ў краіне робяцца рэдкія і дарагія маніпуляцыі на галаўным мозгу, а таксама ў цэлым аб асаблівасцях аказання неўралагічнай дапамогі насельніцтву расказвае дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», доктар медыцынскіх навук, прафесар, галоўны неўролаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Сяргей ЛІХАЧОЎ.**

— Налічваецца некалькі соцень неўралагічных хваробаў, хваробаў нервовай сістэмы. Усе іх можна падзяліць на групы. Па-першае, сасудзістыя хваробы галаўнога і спіннога мозгу, да якіх адносяцца вострыя парушэнні мазгавога кровазвароту, хранічныя формы такіх парушэнняў, якія часта бываюць у людзей сталага ўзросту — дысцыркуляторныя энцэфалапатыі. У больш маладых асобаў могуць назірацца пачатковыя праявы парушэння мазгавога кровазвароту. У гэту ж групу ўваходзяць васкуліты — запаленчыя хваробы сасудаў галаўнога мозгу, якія таксама паступова прыводзяць да розных парушэнняў мазгавога кровазвароту... Яшчэ адна група — запаленчыя працэсы нервовай сістэмы. Энцэфаліты, энцэфаламіеліты і іншыя станы, якія могуць быць віруснага, бактэрыяльнага і невядомага паходжання... Ёсць дэгенератыўныя парушэнні, — адхіленні, закладзеныя ў генах. Такія парушэнні не лечацца, знімаюцца толькі іх сімптомы. Змагацца з імі можна адным шляхам — генетычнага абследавання, кансультавання ў генетыка, каб папярэдзіць перадачу захворванняў у спадчыну. Цяпер мы спрабуем збіраць звесткі аб рэальнай колькасці такіх хворых... Група дэміенілізуючых захворванняў вылучаецца разбурэннем аднаго з бялкоў, з якіх будуецца нервовая сістэма. У выніку развіваецца такое захворванне, як рассеяны склероз... Асобная група — пухліны галаўнога і спіннога мозгу і нерваў. Сярод іх ёсць такія, што добра паддаюцца прамянёваму абпраменьванню, а значыць, не маюць патрэбы ў апаратыўным умяшанні. Ёсць яшчэ група пэўных сіндромаў. Асобна варта назваць радыкуліты. І, нарэшце, чэрапна-мазгавыя траўмы, якія адносяцца да ліку тых захворванняў нервовай сістэмы, што ў першую чаргу ўплываюць на дэмаграфічную сітуацыю...

**— Можна сказаць, што неўралагічныя захворванні становяцца ўсё больш распаўсюджанымі?**

— Адназначна сцвярджаць гэта нельга. Пра распаўсюджанасць пэўных хваробаў мы яшчэ мала ведаем. Эпідэміялогія інфекцыйных хваробаў вывучалася, а вось неінфекцыйных толькі пачынае вывучацца... На сёння нам удалося сабраць досыць сур'ёзныя звесткі па некаторых захворваннях. Так, мы ведаем цяпер, што ў краіне пражывае каля 530 хворых з факальнай мышачнай дыстаніяй, каля сотні хворых з хваробай Гентынгтона... Але збор інфармацыі яшчэ працягваецца.

**— А што можна сказаць адносна больш распаўсюджаных захворванняў?**

— Безумоўна, мы вядзём статыстыку адносна тых жа парушэнняў мазгавога кровазвароту, рассеянага склерозу, вертабрагеннай паталогіі нервовай сістэмы — радыкулітаў... Аднак і тут цяжка сцвярджаць, што мае быць пэўны рост распаўсюджанасці. Узяць хоць бы цэрэбраваскулярную паталогію. Тая ж дысцыркуляторная энцэфалапатыя 2-й ступені — досыць частая з'ява сярод сталых людзей, але яна не надта перашкаджае якасці жыцця, і часта людзі або наогул не звяртаюцца да ўрача, або не хочуць мець такі дыягназ, паколькі ён служыць падставай для абмежавання ваджэння аўтамабіля... Не ўсё так проста. Нават сама мяжа паміж старасцю здаровай і не зусім здаровай досыць размытая. З аднаго боку, пацыента можна назваць хворым, а з другога — у прынцыпе здаровым...

**— Што ляжыць у аснове паспяховага лячэння тых жа сасудзістых захворванняў нервовай сістэмы?**

— Лячэнне гэтай паталогіі заключаецца ў агульным лячэнні сасудзістых хваробаў, а менавіта артэрыяльнай гіпертэнзіі, атэрасклерозу і цукровага дыябету. Гэта ёсць прафілактыка сасудзістых парушэнняў. Плюс барацьба з тытунёвай і алкагольнай залежнасцямі...

**— Такая прафілактыка сапраўды эфектыўная, здольная прадухіліць развіццё сасудзістых хваробаў і катастроф?**

— Безумоўна. Гэта паказаў вопыт многіх замежных краін, якія ідуць па такім шляху ўжо шмат гадоў, і таму цяпер маюць пэўныя вынікі сваіх намаганняў. Па-першае, у шэрагу краін проста немагчыма закурыць або з'явіцца ў нецвярозым стане на вуліцы, непрыстойна мець лішнюю вагу. Па-другое, кожны чалавек сёння павінен кантраляваць артэрыяльны ціск і ведаць, што ў яго — артэрыяльная гіпертэнзія, а значыць, яму неабходна сістэматычна атрымліваць адпаведнае лячэнне. На жаль, у нас яшчэ шмат людзей з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, якія не спяшаюцца да спецыялістаў.

**— Магчыма, людзі проста не вераць у тое, што іх праблему ўдасца вырашыць...**

— Сёння на ўзбраенні кардыёлагаў і тэрапеўтаў — самы шырокі спектр патрэбных лекаў. І калі лячэнне падабрана правільна, калі пацыент прыслухоўваецца да парадаў спецыяліста, поспех гарантаваны... Пацыент сам павінен усведамляць неабходнасць лячэння. Гэта цалкам яго асабістая справа — набыць танометр, мераць ціск, ужываць прэпараты.

**— Дапусцім, сасудзістыя хваробы можна прафілактаваць. А як папярэдзіць тыя, што выкліканы вірусамі, ад якіх, як вядома, пазбавіцца немагчыма?**

— Запаленчая група абумоўлена ў многім дзейнасцю ў нашым арганізме бактэрый і такіх вірусаў, як вірус герпесу, цытамегалавірусам і вельмі вялікай колькасцю іншых. Гэта ўжо агульная медыцынская праблема, а не выключна неўралагічная. Вірус таго ж герпесу ёсць амаль ва ўсіх людзей, якім больш за чатыры гады. Як ён сябе будзе паводзіць, ніхто не ведае. Усё залежыць ад стану імунітэту. Чым ён мацнейшы, тым у віруса менш шанцаў размнажацца і правакаваць тыя ці іншыя захворванні.

**— Наколькі я разумею, самае важнае ў дачыненні да неўралагічных хваробаў — не дапусціць іх узнікнення, таму што калі яны з'явяцца, то гаворка пойдзе, галоўным чынам, аб пазбаўленні ад той ці іншай сімптаматыкі, але не пра поўнае выздараўленне?**

— У дачыненні да большай часткі неўралагічных хваробаў, сапраўды, так і ёсць. Узяць хоць бы тыя ж дэменцыі — зніжэнне інтэлекту ў старых людзей, у тым ліку хваробу Альцгеймера. Яны яшчэ даследуюцца, вывучаюцца. Аб вылечванні гаварыць не даводзіцца, але палепшыць якасць жыцця такіх хворых з дапамогай лекаў можна...

**— А ў чым асноўнае прызначэнне такіх цэнтраў, як цэнтр неўралогіі?**

— Беларуская медыцына цяпер наогул вельмі актыўна развіваецца. Сёння няма праблем, напрыклад, з абследаваннем на камп'ютарным тамографе. Рэанімацыйныя аддзяленні нават у раённых бальніцах — на вышэйшым узроўні. Развіваецца і высакакласная спецыялізаваная медыцына. Усе навукова-практычныя цэнтры аснашчаюцца найноўшай апаратурай. Пасля рэканструкцыі новы корпус нашага цэнтра будзе аснашчаны такой тэхнікай, што нам пазайздросцяць многія калегі з блізкага замежжа.

Для нашага нейрахірургічнага аддзела — ён знаходзіцца на базе 5-й гарадской клінічнай бальніцы — набыта абсталяванне, якое дазваляе рабіць эндаваскулярныя нейрахірургічныя аперацыі, калі з дапамогай катэтара лечацца, напрыклад, анеўрызмы галаўнога мозгу — змененыя сасуды, якія могуць выклікаць раптоўную смерць. Гэта не азначае, што мы адмаўляемся ад тых аперацый, што выконвалі раней. Але найноўшая нейрахірургія дазваляе падабрацца да тых сасудаў, да якіх іншымі шляхамі падабрацца проста немагчыма. На вялікі рахунак, такія аперацыі не маюць вялікага значэння для дэмаграфічнай сітуацыі, але менавіта яны вызначаюць клас медыцыны ў краіне. Людзі павінны ведаць, што ў нас ёсць увесь спектр аказання дапамогі... Гаворка ідзе пра 160—170 аперацый у год, але такімі хворымі не могуць займацца абласныя цэнтры. Вядома ж, перадавыя тэхналогіі неабходна ўкараняць і там, але ў першую чаргу ў вобласці павінна быць усё неабходнае для лячэння вострых станаў, напрыклад, кровазліцця, выдалення тромба. І такая практыка паступова ўкараняецца. Падобныя ўмяшанні ажыццяўляюць ужо ў Гродне.

**— Што можна сказаць пацыенту, які хоча атрымліваць дапамогу не ў вобласці, а ў вашым высакакласным цэнтры?**

— Мы бяром пацыентаў толькі паводле паказанняў. Не можа кожны чалавек, у якога забалела галава, абследавацца ў нас. Тады мы не акажам дапамогу тым, каму яна патрэбна.

**— Але ж чалавек мае права трапіць да добрага неўролага, атрымаць належную кансультацыю і абследаванне хутка і якасна. Не думаю, што зараз у рэспубліцы гэта так проста... Можа, цэнтру варта шырока развіваць платныя паслугі?**

— У Італіі, напрыклад, чарга на электраміяграфію — бясплатнае даследаванне мышцаў — каля месяца. Хочаш адразу — заплаці. Аднак, павінен заўважыць, што ў нас такога быць не можа. Рабочы графік нашых спецыялістаў прыстасаваны для бясплатных абследаванняў. У які ж час урач павінен будзе прыняць платніка? З другога боку, чалавек, у якога ёсць грошы, можа звярнуцца ў камерцыйны цэнтр. Што датычыцца колькасці неўролагаў, то іх, з аднаго боку, нестае, а з другога... У Вялікабрытаніі пражывае каля 50 мільёнаў чалавек і працуе 180 неўролагаў. У нашай краіне такіх спецыялістаў 1200. Проста ў Вялікабрытаніі аказанне першаснай неўралагічнай дапамогі ўскладзена на сямейных урачоў. Мы таксама навучаем нашых тэрапеўтаў аказанню такой дапамогі. Але ж гэта справа не аднаго дня.

**— І ўсё ж такі чаму ў цэнтры няма платных паслуг?**

— Ёсць, але толькі для замежнікаў. Да нас на сеанс мануальнай тэрапіі прыходзяць хворыя з вертэбрагенным паражэннем нервовай сістэмы. Паводле закона, яны маюць права на бясплатную дапамогу. Чаму ж мы павінны браць з іх грошы? Спецыфіка захворванняў не дазваляе прыйсці да агульнага прынцыпу, паводле якога можна браць у разлік не толькі жаданне пацыента. А раптам у такога пацыента аказваецца захворванне, якое не дазваляе яму прыняць рашэнне самастойна?.. Пры жаданні сёння можна трапіць на прыём да тэрапеўта, а калі спатрэбіцца, то і да неўролага. Наш цэнтр адчынены для тых, каму не могуць дапамагчы на іншых узроўнях.

Гутарыла **Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Без змяненняў

Выбары-2008

**Цэнтрвыбаркам разгледзеў скаргі кандыдатаў у дэпутаты па выніках выбараў**

Як адзначыла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, 24 скаргі (большая частка з тых, што паступілі ў Цэнтральную камісію) аб прызнанні выбараў несапраўднымі былі накіраваныя на разгляд у акруговыя выбарчыя камісіі, паколькі гэта датычылася іх кампетэнцыі.

— На рашэнні акруговых выбарчых камісій паступіла пяць скаргаў, — праінфармавала Л. Ярмошына, адкрываючы пасяджэнне Цэнтрвыбаркама. — Такім чынам, 19 кандыдатаў відавочна пагадзіліся з рашэннем акруговай выбарчай камісіі.

Звароты тых пяцярых кандыдатаў, якія не пагадзіліся з рашэннем акруговых камісій аб адмове ў прызнанні выбараў несапраўднымі, разглядалі ўчора падчас пасяджэння члены ЦВК. Дарэчы, у скарочаным складзе: як вядома, адзін з членаў ЦВК «перакачаваў» у сенатары, а двое зараз занятыя на назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Азербайджане. Тым не менш, удзельнікаў пасяджэння было дастаткова для прыняцця рашэнняў. Члены ЦВК з правам дарадчага голасу на пасяджэнні не прысутнічалі, паколькі іх паўнамоцтвы скончыліся, роўна як і міжнародных назіральнікаў. Аднак апошнія на мерапрыемстве былі.

— Цэнтральная камісія зыходзіць з нефармальнага характару адносінаў, — падкрэсліла старшыня Цэнтрвыбаркама, — і мы не збіраемся тыя добрыя адносіны, якія склаліся паміж намі і ўсімі назіральнымі місіямі, заканчваць на фармальнай ноце. Менавіта таму ў парадку выключэння была прадастаўлена магчымасць сёння прысутнічаць назіральнікам.

У выніку разгляду скаргаў кандыдатаў Сяргея Калякіна (балатаваўся па 106-й акрузе), Мікалая Расюка (87 акруга), Уладзіміра Сякеркі (32 акруга), Аляксандра Бухвостава і Уладзіміра Маркава (абодва па 91-й акрузе), ЦВК пакінуў рашэнне акруговай камісіі ў сіле.

Не былі задаволеныя і дзве скаргі, прэтэнзіі ў якіх датычыліся паўторнага пераліку галасоў. А яшчэ дзве скаргі засталіся без разгляду, паколькі былі пададзеныя з парушэннем тэрмінаў, прадугледжаных заканадаўствам.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ПРАЖЫВІ 100 ГАДОЎ!

З 13 па 16 кастрычніка ў Гомельскай вобласці праходзіць традыцыйная акцыя здароўя пад дэвізам «Пражыві 100 гадоў!» Яе арганізатар — Гомельскі абласны цэнтр гігіены эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. У Беларусі, у тым ліку на Гомельшчыне, склалася неспрыяльная дэмаграфічная сітуацыя. Сярэдняя працягласць жыцця ў рэспубліцы — адна з самых нізкіх у Еўропе і складае 68,8 года. Мужчыны жывуць крыху больш за 62, а жанчыны — за 75 гадоў. І хоць летась у вобласці некалькі павысілася нараджальнасць (2006 г. — нарадзілася 14 793 чалавекі, 2007 г. — 15 931), але смяротнасць насельніцтва па-ранейшаму перавышае нараджальнасць (2006 г. — памерла 22 200 чалавек, 2007 г. — 21 114). Дарэчы, на Гомельшчыне 100-гадовы ўзрост пераадолелі 52 чалавекі. Большая частка з іх — вяскоўцы.Кансультацыі па тэлефоне (74 77 64) будуць даваць валеолагі (спецыялісты па здаровым ладзе жыцця), псіхолагі, кардыёлагі, дзіцячы рэабілітолаг, акушэр-гінеколаг, анколаг, урач-герыятр...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**




## ДАПАМОГА МАЦІ-АДЗІНОЧЦЫ

***Я не замужам і хутка стану маці-адзіночкай. Ці магу я свайму будучаму дзіцяці даць тое імя па бацьку, якое сама захачу? Калі я выйду замуж да дасягнення дзіцем 3 гадоў, ці могуць мяне пазбавіць дапамогі, якая належыць маці-адзіночцы?***

**Ала,** *г. Гродна*

Артыкулам 55 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што пры нараджэнні дзіцяці ў маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе, калі адсутнічае сумесная заява бацькоў аб рэгістрацыі ўстанаўлення бацькоўства або рашэнне суда аб устанаўленні бацькоўства, запіс аб бацьку дзіцяці ў кнізе запісу актаў аб нараджэнні робіцца па прозвішчы маці, уласнае імя дзіцяці і яго імя па бацьку запісваюцца паводле ўказання маці.

У выпадку, калі бацькоўства не ўстаноўлена, правы і абавязкі дзіцяці ўзнікаюць толькі ў дачыненні маці і яе сваякоў.

Згодна з артыкулам 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (у рэдакцыі ад 28.12.2007 г.) дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў назначаецца ў памеры 80 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму. Да гэтай дапамогі, у адпаведнасці з артыкуламі 3 і 23 вышэйназванага Закона, устанаўліваецца штомесячная надбаўка на дзяцей, народжаных жанчынамі па-за шлюбам, калі звесткі аб бацьку дзіцяці ў кнізе рэгістрацыі актаў аб нараджэнні зроблены паводле ўказання маці. Надбаўка назначаецца і выплачваецца ў памеры 75 працэнтаў дапамогі да спаўнення дзіцяці 1,5 года і 40 працэнтаў дапамогі на дзіця ва ўзросце ад 1,5 да 3 гадоў.

Артыкулам 23 Закона ўстаноўлена, што выплата гэтай надбаўкі спыняецца ў выпадку ўсынаўлення (удачарэння) або прызнання бацькоўства ў судовым парадку, назначэння на дзіця пенсіі з выпадку страты карміцеля, уступлення жанчыны ў шлюб альбо сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі з мужчынам, які не знаходзіцца з ёй у зарэгістрыраваным шлюбе. Факт сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі ўстанаўліваецца ў парадку, што вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, дапамогі на дзіця вас пазбавіць не могуць незалежна ад таго, выйдзеце вы замуж ці не. А вось выплату надбаўкі да гэтай дапамогі спыняць не толькі пасля рэгістрацыі шлюбу, але і пасля таго, як будзе ўстаноўлены факт вашага сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі з мужчынам, з якім шлюб вы, магчыма, і не збіраецеся рэгістраваць.

## НАВАСЕЛЛІ Ў СЛАВЕНЯХ І ГАРАДЦЫ


Сям'я Аляксандра Фёдаравіча і Антаніны Пятроўны САЎЧАНКАЎ каля новага дома.

У Шклоўскім раёне калектыў ААТ «ААБ Беларусбанк» інвесціруе немалыя сродкі ў развіццё аграгарадка Гарадзец і не толькі. Днямі, дзякуючы менавіта «Беларусбанку» ў раёне адбыліся два наваселлі. Спачатку старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Н. Ермакова ўручыла ключы ад новага катэджа, пабудаванага ў аграгарадку Вялікія Славені, шматдзетнай прыёмнай сям'і Саўчанкаў. Яна адзначыла, што гэта пакуль што першы такі дом, але на гэтым калектыў банка спыняцца не мае намеру і будзе працягваць высакародную справу ў іншых раёнах рэспублікі. Надзея Андрэеўна, як старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын» і член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу выказала спадзяванне, што кіраўнікі буйных прамысловых прадпрыемстваў і іншых вядучых банкаў краіны падтрымаюць ініцыятыву Беларусбанка і таксама пачнуць будаваць катэджы для шматдзетных і прыёмных сем'яў, уносячы гэтым свой уклад у паляпшэнне дэмаграфічнага стану Беларусі.

Другое наваселле адбылося ў аграгарадку Гарадзец — цэнтральнай сядзібе ПУП «ААБ Гарадзец». Тут Н. Ермакова разам са старшынёй Шклоўскага райвыканкама, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу В. Івановым і дырэктарам ПУП «ААБ Гарадзец» А. Лесніком адкрылі новы шматфункцыянальны будынак, які ўзвялі на цэнтральнай плошчы аграгарадка будаўнікі горацкага акцыянернага таварыства «Будаўнік» пад кіраўніцтвам В. Стасько.

У гэтым прыгожым палацы пад адным дахам размясціліся Дом культуры, аддзяленні ААТ «ААБ Беларусбанк» і паштовай сувязі, комплексны прыёмны пункт КБА, кафетэрый і магазін райпа. У Доме культуры, да таго ж, функцыянуюць Дом рамёстваў, філіял шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, бібліятэка і музей.

За два-тры апошнія гады пры дапамозе «Беларусбанка» вёска Гарадзец змянілася непазнавальна. Тут пабудаваны сучасныя малочны комплекс і зерняток, завяршаецца рэканструкцыя машыннага двара, будаўніцтва новай рамонтнай майстэрні і дома механізатараў. Некалькі дзясяткаў новых катэджаў і дзіцячы садок значна ўпрыгожылі вёску. Узводзіцца адміністрацыйны будынак, дзе размесцяцца дырэкцыя гаспадаркі і Гарадзецкі сельвыканкам, закладваюцца падмуркі новых жылых дамоў, былы сельскі клуб пераабсталёўваецца ў сучасную сталоўку. Шмат чаго робіцца і ў плане добраўпарадкавання не толькі аграгарадка Гарадзец, але і іншых вёсак гаспадаркі.

**Аляксандр БЯЛЯСАЎ.**
**Фота аўтара.**

## З ВЯСНЫ КОШТ БУДАЎНІЦТВА КВАДРАТНАГА МЕТРА ДЛЯ СТАЛІЧНЫХ ЧАРГАВІКОЎ ПАДАРАЖЭЎ ПРЫКЛАДНА НА 30 ПРАЦЭНТАЎ

**Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва КУП УКБ Мінгарвыканкама Алена Пяхота.**

Згодна з пастановай Мінбудархітэктуры № 18, у кошт квадратнага метра ўключаецца і кошт унутрыквартальных інжынерных сетак, добраўпарадкаванне і азеляненне. На працягу трох апошніх гадоў горад аплачваў фінансаванне гэтых работ з мясцовага бюджэту.

— Пасля апошняй праверкі дзейнасці Мінгарвыканкама горад быў вымушаны адмовіцца фінансаваць будаўніцтва гэтых сетак з уласных крыніц, — удакладніла Алена Уладзіміраўна. — У залежнасці ад серыі ўзводзімых дамоў масавай забудовы квадратны метр жылля для тых, хто будуе кватэры ў якасці маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, цяпер будзе каштаваць ад 1 млн 300 тысяч да 1 млн 600 тысяч рублёў. Істотнае падаражэнне жыллёвага «квадрата» звязана і з іншымі фактарамі — ростам заробкаў будаўнікоў і павелічэннем кошту энерганосьбітаў. Толькі цэментная прадукцыя з пачатку года падаражэла на 92 працэнты, істотна павялічыўся кошт іншых будматэрыялаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Пракуратура Гродзенскай вобласці звярнула ўвагу на частыя ДТЗ з-за адкрытых дарожных люкаў

Толькі з пачатку 2008 года ў вобласці зарэгістравана 26 такіх выпадкаў.

Так, грамадзянін, які рухаўся на аўтамабілі па вул. Горкага ў Гродне, наехаў на адкрыты каналізацыйны калодзеж. У выніку гэтага аўтамабіль атрымаў тэхнічныя пашкоджанні. Паколькі калодзеж знаходзіўся на абслугоўванні КУП «Рамбудаўтадар», пацярпеламу па яго заяве быў кампенсаваны матэрыяльны ўрон у памеры Br490 тыс.

У водаправодным калодзежы ў вёсцы Дзеравянчыцы Слонімскага раёна быў знойдзены труп жыхаркі гэтай вёскі. У ходзе праведзенай праверкі ўстаноўлена, што ў парушэнне дзеючых нарматываў люк калодзежа не быў закрыты накрыўкай, што і прывяло да гібелі жанчыны.

У выніку праведзенага аблпракуратурай рэйду толькі за адзін дзень у Гродне было выяўлена 5 адкрытых шахтавых калодзежаў, размешчаных паблізу пешаходных тратуараў і дарог, што магло прывесці да няшчасных выпадкаў.

## Да адміністрацыйнай адказнасці — каля тысячы пешаходаў штотыдзень

ДАІ Мінскай вобласці за невыкарыстанне святлоадбівальных элементаў кожны тыдзень прыцягвае да адміністрацыйнай адказнасці каля тысячы пешаходаў, паведамілі ва УДАІ УУС Мінаблвыканкама.У ДАІ адзначылі, што ўсім пешаходам пры перамяшчэнні ў цёмны час сутак па краі праезнай часткі, неабходна быць абазначанымі святлоадбівальнымі элементамі.

**Кар. БЕЛТА.**


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

## БУСЛЫ НАД СКІДАЛЕМ

Далёкае — блізкае

Напярэдадні 500-гадовага юбілею ў Скідалі ўстаноўлена скульптура «Клёкат буслоў», заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Церабуна, якая з'яўляецца нулявым мерыдыянам горада. На гранітным крузе пастамента — чатыры стрэлкі па накірунках частак свету.

У свой час Скідаль меў статус раённага цэнтра, а сёння гэта, можна сказаць, неафіцыйная сталіца Гродзенскага раёна, дзе размешчаны яго буйнейшыя прадпрыемствы. І, вядома ж, яны не засталіся ў баку ад маштабнай, раней небывалай рэканструкцыі, якая ўпрыгожыла горад. Прыведзены ў парадак не толькі гарадскія дарогі і вуліцы, але і тэрыторыі прадпрыемстваў, школ, устаноў культуры, гандлёвых аб'ектаў. Падчышчана рачулка Сушанка, пабудаваны новы масток. Адрэстаўравалі дзве вежкі ад маёнтка Чацверцінскіх з гербамі былога мястэчка...

Значную фінансавую падтрымку рэканструкцыі Скідаля аказалі абласны і раённы выканаўчыя камітэты. Аднак тут разлічваюць не толькі на бюджэтныя сродкі, але і на развіццё прадпрымальніцтва. Да прыкладу, ужо тры магазіны адчыніла ў Скідалі дырэктар прыватнага прадпрыемства з Парэчча Ганна Шандэрук. У найбліжэйшай перспектыве інфраструктура горада папоўніцца рэстаранна-гасцінічным комплексам і гандлёвым домам на 500 квадратных метраў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## СЯМЕЙНЫ ПІРОГ

Мінчанка Ірына Камоцкая мае ўсе падставы, каб адчуваць сябе самай шчаслівай жанчынай. Каханы муж — Генадзь Анатольевіч і сямёра цудоўных дзяцей!

Два гады таму сям'я перасялілася ў новую 4-пакаёвую кватэру. Пасля маленькай двухпакаёўкі з мізэрнай кухняй, новая здалася прасторным раем.

Бацька з сынамі змайстравалі самі амаль усю мэблю. Дызайн таксама прыдумвалі самі — і каб прыгожа было, і каб практычна.

Ірына Віктараўна, швачка «Мілавіцы», і Генадзь Анатольевіч, інжынер па абсталяванні невялікага прадпрыемства «Юстына», працуюць у розныя змены, каб малодшыя не заставаліся без нагляду. Старэйшая дачка Святлана — студэнтка педкаледжа, Павел вучыцца ў тэхнікуме прадпрымальніцтва. А Міша, Раман, Люда, Алена і малодшая Надзейка — вучні сярэдняй школы № 111. Сабраць усю сям'ю разам удаецца толькі ў выхадны. Тады ў доме шумна і весела. Разам прыгатаваць святочны абед ці ўдзельнічаць у стварэнні якога-небудзь кулінарнага шэдэўра — шчаслівыя, радасныя хвіліны для ўсёй сям'і.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**



Транспартная філасофія

# БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ,
## ЦІ КАЛІ СТАРЭЙШЫЯ НЕ ЧЫТАЮЦЬ ТУРГЕНЕВА



Маці з дзесяцігадовым сынам едзе дадому, напэўна з працы. Сына забрала са школы, стамілася — пра гэта яна сведчыць усім сваім выглядам. Але ніхто не звяртае ўвагі і не саступае ёй месца — усе едуць з працы. У надзеі на добрых людзей маці хапаецца за галаву, дэманструючы боль, тузае сына за руку, дэманструючы раздражнёнасць. Ніхто па-ранейшаму не звяртае на яе ўвагі, ці робіць выгляд, што не звяртае. Тады пакалашмачаны сын пяшчотна-пяшчотна абдымае маці, дацягваецца сваёй маленькай далонню да яе ілба і так, прытуліўшыся да яе, моўчкі стаіць. Пасля адпускае руку і, зазіраючы ў вочы, пытаецца: «Так лепш?». Маці нічога не засталося, як ласкава ўсміхнуцца ў адказ, схамянуцца, настроіць бадзёры выраз твару і прамовіць: «Так, усё прайшло!». Можа, і сапраўды прайшло? Вылечыла сыноўняя любоў.

***

— Мама, я хачу сесці, — толькі ўвайшоўшы ў аўтобус, патрабавальным голасам заяўляе хлопчык, гадоў сямі.

— Ну, пачакай, сынулечка. Вось зараз жанчына будзе выходзіць, і ты сядзеш. Пацярпі трошачкі, мой маленькі, — сюсюкаецца мамаша.

— Мама, я зараз хачу сесці! Я не хачу чакаць. У мяне стаміліся ножкі! Чаму ніхто не ўстае: я хачу сесці! — істэрычна працягвае хлопчык.

— Прабачце, калі ласка, вы б не маглі саступіць яму месца? Мы доўга хадзілі па кірмашы, ён стаміўся. Малыя ж, ведаеце, не вытрымліваюць вялікіх нагрузак, — маці вінавата просіць сядзячага побач мужчыну, гадоў сарака сямі.

— І не падумаю. Я цэлы тыдзень працаваў, каб такія, як ён, хадзілі ў школу, вучыліся грамаце, раслі і станавіліся добрымі людзьмі. А сёння ў мяне выхадны. Я стаміўся і маю права на адпачынак. Няхай дарасце да маіх гадоў.

— Мужчына, гэта ж дзіця, — уступае ў спрэчку немаладая дама з суседняга крэсла. — Так нельга. Яны ж наша будучыня. Сядай, хлопчык. Я трошкі пасунуся — нам на дваіх месца хопіць.

Хлопец недаверліва паглядзеў на даму, скрывіўся... і ўсеўся на яе свежавыпрасаваную спадніцу, шчыльна прыціснуўшы жанчыну да акна.

— Ой, дзякуй вялікі. Вось бачыш, мой маленькі, свет не без добрых людзей. Вельмі баляць ножкі?

«Маленькі» толькі незадаволена пакрывіўся ў адказ.

А пасля мы думаем, адкуль у звычайных сем'ях вырастаюць нявыхаваныя монстры. Так выхоўваюць.

***

У метро — цісканіна. Я ўжо шкадую, што не пачакала наступнага цягніка. Не пашанцавала нават тым, хто паспеў заняць крэсла: іх прыціскаюць, на іх вешаюць сумкі, на іх падаюць людзі. Хударлявы малады чалавек, які займае два месцы, раскінуўшы ногі, атрымлівае асалоду ў навушніках.

Заціснутая з усіх бакоў яго суседка не вытрымлівае і крычыць на ўвесь цягнік:

— Малады чалавек, зрабіце музыку цішэй! У мяне ў галаве стукае ад яе!

Не рэагуе. Жанчына цярэбіць хлопца за рукаў і паўтарае сваю просьбу. Ён павольна падымае вочы, пільна глядзіць на яе, не здымаючы навушнікаў, рэзка адштурхоўвае руку, робіць гучнасць мацней, раскідвае ногі яшчэ больш, заплюшчвае вочы і адкідвае галаву. Схамянуцца хлопца прымушае новы, больш моцны, штуршок у плячо.

— Аглох, ці што! — крычыць мужчына. — Ногі прыбяры! І ўзніміся, у рэшце рэшт, вакол адны сталыя людзі, а ён рассеўся! Саступі месца бабульцы!

— Ды пайшоў ты! Ведаеце, дзе я вас усіх бачыў!.. Што ты лезеш да мяне! Што вучыш! Адвалі, я сказаўы!

Далей пасыпалася ненарматыўная лексіка з абодвух бакоў. І тумакі. Дасталася і тым, хто стаяў-сядзеў-ляжаў побач. І бабульцы таксама.

— Аё-ё-ёй! Цішыйця, дзетачкі. Не навучылі бацькі словам — цяпер кулакамі не навучыш.

***

Я рэдка сяджу ў транспарце. А калі саджуся, адразу шукаю вачыма, каму саступіць месца. На гэты раз знайшла хутка. У цягнік увайшла сталая жанчына з яркарудымі валасамі. Я заўважыла яе з таго канца вагона. Кульгаючы і не трымаючыся за поручань, яна прайшла праз увесь вагон, быццам ведала, ці хацела сесці менавіта на маё месца. Падскокваю і дапамагаю справіцца з хворай нагой.

— Дзякуй, дачушка!

Вось яны: бацькі і дзеці. Вось яна: новая транспартная сям'я.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

# Першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання па жаданні абітурыентаў пачаўся ў Беларусі

Як раскажаў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (РІКЗ) Міністэрства адукацыі Мікалай Фяськоў, па жаданні абітурыенты могуць выпрабаваць свае веды па ўсіх навучальных прадметах у тры этапы: першы — кастрычнік—снежань, другі — студзень—люты, трэці — сакавік—красавік. Кожная навучальная ўстанова, вызначаная месцам правядзення іспытаў, сама прызначае даты правядзення рэпетыцыйных тэсціраванняў. У большасці навучальных устаноў запіс на тэсціраванне пачынаецца з сярэдзіны кастрычніка, даведацца больш падрабязную інфармацыю можна ў час рэгістрацыі.

Як падкрэсліў суразмоўца, для выпускнікоў-2009 сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў Мінска падобныя этапы будуць праводзіцца сумесна з камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама на базе агульнаадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў. Для выпускнікоў мінулых гадоў РІКЗ праводзіць рэпетыцыйныя тэсціраванні на базе наступных устаноў адукацыі сталіцы: Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта імя А.Д. Сахарава, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа, Мінскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа і Мінскага дзяржаўнага гандлёвага каледжа.

Рэпетыцыйныя тэсціраванні ў рэгіёнах праводзяць Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Барысаўскі дзяржаўны політэхнічны каледж.

Ва ўсіх вышэйпералічаных навучальных установах тэсціраванне па жаданні праводзіцца па матэрыялах РІКЗа, апрацоўка бланкаў адказаў і аналіз выніку ажыццяўляецца таксама па тэхналогіях ЦТ. Сертыфікаты на гэтых этапах не выдаюцца. Выпрабаванні арганізаваны па такіх прадметах, як руская і беларуская мовы, фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, англійская, нямецкая, іспанская і французская мовы, гісторыя Беларусі, геаграфія, грамадазнаўства («Чалавек. Грамадства. Дзяржава») і Сусветная гісторыя найноўшага часу.

Аплата за ўдзел у тэсціраванні ў суме Br16 тыс. 100 па адным навучальным прадмеце ажыццяўляецца ў любым аддзяленні ААТ «ААБ Беларусбанк».

Мікалай Фяськоў асабліва падкрэсліў, што супрацоўнікі РІКЗа не адказваюць за якасць і змест тэстаў для тэсціравання, якое праводзіцца іншымі (не ўказанымі ў дадзеным спісе) установамі. «Усе тэсты і тэхналогіі апрацоўкі выніку тэсціравання ва ўстановах, якія не ўказаны ў спісе, нічога агульнага з ЦТ РІКЗа не маюць», — разважаў дырэктар інстытута.

**Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.**

Школа падаткаплацельшчыка

# Калі вырошчваць вазоны на продаж...

*Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння чарговую кансультацыю нашаму выданню даюць **спецыялісты галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.***

**— Я планую вырошчваць пакаёвыя расліны ў сябе дома і прадаваць іх індывідуальным прадпрымальнікам і магазінам, якія гандлююць кветкамі. Ці трэба мне самой рэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка? Якія падаткі я павінна буду плаціць?**

**Алена ТРЫДЗЕНЬ,** *г. Мінск.*

— Згодна з Грамадзянскім кодэксам Беларусі, прадпрымальніцкай дзейнасцю лічыцца самастойная дзейнасць юрыдычных і фізічных асобаў, якая ажыццяўляецца ў грамадзянскім абароце ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю маёмасную адказнасць, накіраваная на сістэматычнае атрыманне прыбытку ад карыстання маёмасцю, продажы рэчаў, вырабленых, перапрацаваных ці набытых указанымі асобамі для продажу.

З улікам таго, што ў разглядаемай сітуацыі ваша дзейнасць накіравана на сістэматычнае атрыманне прыбытку, то яна мае прызнакі прадпрымальніцкай. Менавіта таму вам трэба рэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.

Пры рэалізацыі пакаёвых раслін іншым індывідуальным прадпрымальнікам і арганізацыям вы маеце права выкарыстоўваць спрошчаную сістэму падаткаабкладання з пачатку рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Уплата падатку па спрошчанай сістэме замяняе ўплату падаткаў і збораў у мэтавыя бюджэтныя і пазабюджэтныя фонды. Выключэнне складаюць наступныя віды падаткаў, збораў (пошлінаў), уплата якіх ажыццяўляецца ў агульным парадку:

— падаткі, зборы (пошліны), якія збіраюцца пры ўвозе (вывазе) тавараў на мытную тэрыторыю Беларусі;

— дзяржаўная пошліна;

— афшорны збор;

— гербавы збор;

— падатак на даходы ад аперацый з каштоўнымі паперамі;

— падатак на набыццё аўтамабільных транспартных сродкаў;

— абавязковыя страхавыя ўзносы і іншыя адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва;

— падатак на дабаўленую вартасць, за выключэннем індывідуальных прадпрымальнікаў, якія атрымліваюць валавую выручку ў памеры звыш 450 млн, але не больш 1500 млн рублёў на працягу першых дзевяці месяцаў года, які папярэднічае году, з якога разлічваюць на яе атрыманне.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

Пакаленне ХХІ

# МАКСІМаліст Паніматчанка



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# і яго жыццёвая палітра

«Ён так смачна расказвае, што слінкі набягаюць», — пачула аднойчы ад знаёмай, заўзятай аматаркі глядзець тэлевізар...

Гледзячы на падцягнутага, стройнага, рухавага Максіма Паніматчанку, неяк не ўяўляеш яго ў кулінарнай праграме. Тым не менш ужо без малога год Максім, між іншым, тэатральны акцёр і рэжысёр па адукацыі, прадстаўляе ў ранішнім эфіры АНТ рубрыку «Смаката». І мяркуючы па водгуках гледачоў — нават не такіх эмацыянальных, як мая сяброўка, — робіць гэта цікава і ўмела.

**СМАК ДА ПРАЦЫ**

**— Максім, прызнавайцеся — як вы трапілі ў тэлевізар і дайшлі да такога жыцця?** — уладкаваўшыся ў адной з грымёрак Тэатра беларускай драматургіі, мы пачалі са «смачнай тэмы».

— Я не з'яўляюся аўтарам гэтай рубрыкі, проста пачуў аднойчы, што праводзіцца кастынг, і вырашыў паспрабаваць. Бо мне заўжды дастаўляла задавальненне гатаваць, яшчэ ў самым дзяцінстве, калі выдумваў стравы з нейкіх простых рэчаў. Я ўвогуле вельмі рана ўзяў у рукі кулінарную кнігу. І ў школе, памятаю, калі мы з сябрам прагульвалі ўрокі, спрабавалі, напрыклад, спячы сабе нейкае печыва... Так што гатаваць я і насамрэч люблю.

**— А ці ёсць нейкая любімая, каронная страва? Бо ў рубрыцы ўсё неяк несур'ёзна: ягадкі, арэшкі; толькі нядаўна звярнуліся да «сапраўднай мужчынскай ежы» — мяса.**

— Мы дайшлі да стэйку, нарэшце, чаму я вельмі рады, тым больш гэты выпуск мы здымалі ў адным з маіх любімых рэстаранаў з добрай кухняй. Але і да іншых прадуктаў не варта ставіцца так паблажліва — часам, праходзячы па рынку, мы нават і не задумваемся, якую карысць могуць прынесці ўсе гэтыя «арэшкі-ягадкі». Мне самому вельмі цікава адкрываць для сябе некаторыя рэчы, і хатні рацыён, дарэчы, дзякуючы гэтай рубрыцы таксама мяняецца, робіцца больш разнастайным.

Што да любімай стравы... (на хвілінку задумваецца). Я люблю печань з вінаградам. Калі печань ужо амаль гатовая, трэба не паленавацца ўзяць кішміш — менавіта яго, бо ён без костачак, — разрэзаць на палавінкі і закінуць на патэльню. А ўжо зверху можна дадаць сыр, або каму што больш падабаецца. Галоўнае, што вінаград надае асаблівую салодкасць.

На гэтым моманце, прызнаюся, і я, хоць не была галоднай, адчула ў жываце падазронае бурчанне, таму скіравала ўвагу суразмоўцы ад разважанняў гурмана да больш празаічнай тэмы:

**— Супрацоўніцтва з тэлебачаннем пачалося не так даўно...**

— Так, рубрыка «Смаката» ўпершыню выйшла 14 студзеня гэтага года.

**— Надалей гэта ваша сяброўства працягнецца? Ходзяць чуткі, што вы ў навагоднім мюзікле АНТ «Батлейка» здымаецеся...**

— З АНТ я заўжды супрацоўнічаў, гэта мой любімы канал. Мне вельмі падабалася здымацца яшчэ ў рэкламных роліках, якія рабіў Сяргей Талыбаў — памятаеце, такія стылізаваныя пад чорна-белае ТБ, «як усё пачыналася», а потым «нам — 5 гадоў». Наконт далейшага супрацоўніцтва — канкрэтных размоў пакуль няма, буду чакаць прапаноў. А пра мюзікл — так, у адной з 10 баек (прыдуманых прадзюсарам АНТ Ягорам Хрусталёвым. — **Аўт.**) я буду прадстаўлены ў нечаканым, нават для сябе самога, амплуа.

**АД ВЯЛІКАГА ДА СМЕШНАГА. І НААДВАРОТ**

Акцёрскую кар'еру Максім Паніматчанка пачынаў у камічным амплуа, гэткім «забаўным хлапчуком». Гэта было першае, што прагучала ў яго выкананні на тэатральных падмостках, яшчэ ў бытнасць студэнтам, калі Валерый Данілавіч Анісенка (мастацкі кіраўнік тэатра і кіраўнік курса ва Універсітэце культуры) прыцягваў сваіх вучняў да ўдзелу ў «капусніках». На пытанне, як жа яго мінула чаша «Камедзі Клаб» ды іншых гумарыстычных праектаў, Максім абяззбройвае ўсмешкай: «А я з імі сябрую. Не працую, бо не бачу сябе там, але ў нерабочых пытаннях мы вельмі добра кантактуем». Дарэчы, быў перыяд, калі нашага беларускага акцёра многія блыталі з маскоўскім «гламурным падонкам» Пашам Волям. Летась на здымках «Паўлінкі» адна дзяўчына доўга парывалася сфатаграфавацца разам, і вельмі здзівілася, калі Максім сказаў: «Добра, толькі я не Паша»...

У Максіма і цяпер ёсць забаўныя ролі і казачныя персанажы, але рэжысёры разгледзелі, а тэатралы ацанілі ў ім і іншы патэнцыял — драматычны, які праявіўся ў пастаноўках «Макбет» і «Кароль Лір», «Чарнобыльская малітва» і «Адвечная песня» і іншых. Цікава, колькі яшчэ сюрпрызаў, як у скарбонцы з двайным дном, хаваецца ў гэтым акцёры?

**— Спектакль «Сталіца Эраўнд» з вашым удзелам пачынаецца... з моцнага слоўца. Па-за сцэнай, у жыцці вы можаце даць падобным чынам выхад эмоцыям?**

— Эмоцыі, натуральна, праяўляюцца, але я не хацеў бы імі нікога крыўдзіць і задзяваць. Трэба ж паважаць навакольных людзей. Я лічу эмацыянальны рад — вельмі асабістым, што не варта выносіць на публіку. Можна палаяцца хіба на самога сябе, калі нешта на кухні «падпаліў». А калі на іншых — гэта прыкмета ўласнай слабасці. Давайце лепш радавацца адзін аднаму, паважаць і любіць. Што датычыцца спектакля — не проста так нарадзілася першае моцнае слова, бо на працягу спектакля мой герой праходзіць складаны шлях ад гэтага «б**» да разумення, пераасэнсавання жыцця і сябе самога.

**— Вы не толькі запатрабаваны акцёр, але і рэжысёр. У якой іпастасі больш камфортна?**

— Апошнім часам мне вельмі цікавая рэжысура, прычым не толькі тэатральная, align="" рознабаковая. З задавальненнем назіраю за работай у музычных кліпах, нават з тым невялікім вопытам, што ў мяне ёсць, хацелася б сябе паспрабаваць. Але ў першую чаргу, я лічу, рэжысёр — гэта вопыт, у тым ліку жыццёвы, які прыходзіць з узростам, калі ў чалавека атрымліваецца больш дакладна і правільна выявіць сябе. Адчуваю, што я такі вопыт, багаж паступова назапашваю, і гэта выльецца ў паўнацэнную работу. Некалькі гадоў, напрыклад, я выкладаў у тэатральнай школе сцэнічны рух, і вельмі прыемна, што набыў педагагічны вопыт практычнай працы з дзецьмі. Праца з дзецьмі — гэта ўвогуле асобны від мастацтва... У мяне ёсць самая любімая казачная роля ў пастаноўцы «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвей» — вобраз галоднай мышы, якая пастаянна нешта грызе. Дагэтуль лічу, што гэта адна з лепшых дзіцячых пастановак, можа і ва ўсёй рэспубліцы — дзякуй Сяргею Міхайлавічу Кавальчыку за яго ідэі і за вельмі добры музычны густ.

**— Калі ўзгадалі пра вясёлую казачную ролю — ці ёсць любімыя сярод драматычных?**

— Так, у спектаклі «Кароль Лір» — Эдмунд. Гэта была адна з вельмі сур'ёзных работ з добрым рэжысёрам. На жаль, па тэхнічных прычынах спектакль зараз не ідзе, але ў будучым, магчыма, мы яго яшчэ сыграем.

**— У кінаработах вам прыемна прыгадаць...**

— Вялікіх работ у кіно пакуль што ў мяне няма, але ёсць пара роляў, якія пакінулі прыемныя ўражанні. У «Выкліку», здаецца, чацвёртая частка серыяла здымалася нядаўна, было вельмі цікава — на здымках давялося займацца крыміналістычнай дзейнасцю, паглядзець, што знаходзіцца ў сапраўдных чамаданчыках экспертаў-крыміналістаў... Таксама запомнілася работа ў тэлесерыяле «Вольф Месінг», сцэнарый да якога напісаў вядомы драматург Эдуард Валадарскі, а рэжысёрам выступіў славуты Уладзімір Краснапольскі («Цені знікаюць апоўдні»). Там адчувалася старая добрая школа — акцёрская, аператарская, рэжысёрская.

**— А роля-мара?**

— Яна ў мяне засталася са студэнцкіх часоў — Сірано дэ Бержэрак. Вельмі падабаўся яго падыход да жыцця. Таксама падабаецца антычная драматургія, звязаная з Рымам — вельмі прыемна было ўдзельнічаць у спектаклі «Понцій Пілат». Гэта распаўсюджваецца і на фільмы, асабліва калі яны заснаваныя на рэальных падзеях — паказчык, што фільм варта паглядзець.

**ШВЕЦ, ЖНЕЦ... І ДАЛЕЙ ПА ТЭКСЦЕ**

Выбарам прафесіі ў свой час Максім здзівіў усіх блізкіх: у адзінаццатым — заўважым, эканамічным — класе раптам, у сярэдзіне першай чвэрці, сабраўся і перайшоў у 136-ю сталічную школу, дзе былі класы з тэатральным накірункам. Першага свайго педагога па сцэнічным руху дагэтуль узгадвае з цеплынёй і падтрымлівае сяброўскія стасункі. А пра тое, што не стаў эканамістам, мяркуючы па ўсім не шкадуе.

**— Калі б не тэатр... То ўсёткі харэаграфія?** (Маці Максіма — харэограф, брат — у мінулым прафесійны артыст балета, дый у самога акцёра вельмі добрая загартоўка розных танцавальных студый. — **Аўт**.)

— Цалкам магчыма. Хоць, можа, не харэаграфія ў чыстым выглядзе, бо прыйшоў такі жыццёвы этап, калі я зразумеў, што гэтага мне мала. Можна было б застацца і займацца толькі гэтым, але хочацца знайсці як мага больш спосабаў мастацкага выяўлення сваіх думак, пачуццяў, перажыванняў.

Ён увогуле быў, як кажуць, рознабаковым хлопчыкам — гуляў у вялікі тэніс, танцаваў, добра вучыўся. Праўда, алгебру і фізіку не любіў — на практычных занятках замест рашэння задачак усё нешта маляваў, маляваў... Апошнім не кінуў займацца і цяпер.

**— Жывапісныя здольнасці дапамагаюць у працы?**

— Натуральна. Напрыклад, грым сабе я заўжды накладваю сам (*Смяецца*.) Пры стварэнні касцюмаў часта, калі штосьці прыдумаеш — каб лепш запомніць, замалёўваеш гэта. Ну і ўвогуле, думаю, для творчага чалавека карысна развіваць усякія здольнасці. Зусім нядаўна я набыў сабе мальберт, фарбы, у Пецярбургу ў добрым кніжным магазіне прыдбаў дапаможнік для пачынаючых. Буду спрабаваць працаваць з фігурамі, перадаваць прыгажосць чалавечага цела.

**— Тэатр, тэлебачанне, кіно, рэклама... Калі расставіць прыярытэты, то ў якім парадку яны будуць ісці?**

— Правакацыйнае пытанне. Уяўляеце, кожны з маіх дырэктараў будзе чытаць гэта па-свойму. Таму адкажу так: медыйнасць ніколі не пашкодзіць. У Расіі гэта добра бачна, калі многія тэлеканалы прыцягваюць да ўдзелу ў шоу папулярных людзей з іншых сфераў. І ў тым няма нічога дрэннага, наадварот, цудоўна — палітра герояў атрымліваецца шырэйшая. Плюс ёсць момант заробку — у наш час гэта немалаважна...

**— Але першасны ўсё ж не заробак, а акцёр?**

— Акцёр. А як і ў чым ён праяўляецца ў кожнай сферы — справа густу кожнага з акцёраў.

**— Некаторыя з нашых акцёраў перакваліфікаваліся ў спевакі і пакрысе заваёўваюць шоу-бізнэс. Ваша імя ў гэтым спісе з'явіцца?**

— Я спяваю ў запісе да спектакля «Сталіца Эраўнд», у прынцыпе стараюся развіваць гэты накірунак — гэта таксама адна з тых фарбаў, якія могуць упрыгожыць і расквеціць акцёрскую работу. Але вельмі там ужо вялікім спеваком, шчыра кажучы, я сябе не бачу. Хоць... чым чорт не жартуе? Адкрыю сакрэт: мой добры сябар і калега Дзяніс Паршын рыхтуе канцэрт, у якім я вельмі хачу паўдзельнічаць. Абавязкова спяём нашу песню са спектакля. Дарэчы, яна становіцца ўжо своеасаблівым хітом, я нават аднойчы чуў, як яе выконваюць у падземным пераходзе...

***

**— Псіхолагі раяць раз на сем гадоў мяняць работу. Вы ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі працуеце якраз сем гадоў...**

— Але ж я не стаю на адным месцы. Я знайшоў новыя шляхі і накірункі, у якіх хачу развівацца. Так што тэатр у маім жыцці застанецца (паставім тут тры клічнікі!!!).

**— Ёсць невясёлая тэндэнцыя: як толькі беларускага акцёра заўважаюць расійскія рэжысёры, ён рана ці позна перабіраецца ў Маскву...**

— Можна сказаць, я патрыёт сваёй краіны. Хацеў бы жыць тут. Але час ад часу выязджаць на працу і рабіць нейкія праекты — дзе заўгодна. Дзякуючы тэатру мы гастралюем даволі часта, бачым, як там ідзе жыццё... І — вяртаемся дадому.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

36,6°

# БОЛЬ У СУСТАВАХ? ШУКАЙЦЕ ПРЫЧЫНУ...

**12 кастрычніка па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя на планеце адзначаўся Сусветны дзень барацьбы з артрытам.**

Рост распаўсюджанасці рэўматычных захворванняў назіраецца сёння ва ўсіх краінах свету. Толькі ад рэўматоіднага артрыту церпяць больш як 20 мільёнаў жыхароў планеты. Гэта найбольш небяспечнае захворванне, якое непазбежна прыводзіць да інвалідызацыі. Часцей за ўсё мішэнню для рэўматоіднага артрыту становяцца працаздольныя людзі ва ўзросце ад 30 да 50 гадоў. Жанчыны хварэюць на рэўматоідны артрыт у пяць разоў часцей за мужчын. Усяго праз пяць гадоў з пачатку захворвання палова пацыентаў становяцца інвалідамі і страчваюць працаздольнасць.

Многія памылкова блытаюць паміж сабой артрыт і артроз, хоць гэта абсалютна розныя захворванні, якія патрабуюць рознага лячэння. Артрозы пачынаюцца з узроставых змяненняў у тканках сустава або ў выніку фізічных нагрузак. А пускавы курок для рэўматоіднага артрыту — нейкая схаваная інфекцыя. Дакладна прычыны ўзнікнення рэўматоіднага артрыту невядомыя, але заўважана, што даволі часта развіццю гэтай хваробы папярэднічае вострае рэспіраторнае захворванне, грып, ангіна ці абвастрэнне хранічных інфекцыйных захворванняў. У ролі фактараў рызыкі называюцца таксама моцны стрэс, траўмы, алергія, пераахладжэнне арганізма, спадчыннасць і іншыя фактары.

На жаль, але болі ў суставах сёння настолькі распаўсюджаныя, што многія нават не звяртаюць увагі на раннія прыкметы хваробы. Між іншым, «клініку» класічнага рэўматоіднага артрыту цяжка пераблытаць з сімптомамі іншых сустаўных захворванняў. Як правіла, у пачатку хваробы адбываецца запаленне і прыпуханне запясцева-фалангавых суставаў указальнага і сярэдняга пальцаў рукі, размова ідзе пра суставы, якія знаходзяцца ля асновы гэтых пальцаў, гэта значыць, у вобласці костачак сціснутага кулака. Такое запаленне часцей за ўсё спалучаецца з запаленнем і прыпуханнем прамянёвазапясцевых суставаў. Прычым запаленне суставаў заўсёды сіметрычнае: калі церпяць суставы на правай руцэ, то практычна абавязкова паражаюцца такія ж суставы і на левай руцэ. Адначасова з запаленнем суставаў верхніх канечнасцяў пры рэўматоідным артрыце амаль заўсёды адбываецца паражэнне дробных суставаў ступняў. Запаляюцца суставы, якія знаходзяцца ля асновы пальцаў, што праяўляецца болямі пры націсканні пад «падушачкамі» пальцаў ног. Суставы ног запаляюцца таксама сіметрычна.

Болі ў суставах узмацняюцца часцей за ўсё ў другой палове ночы, бліжэй да раніцы. Прыкладна да поўдня болі вельмі інтэнсіўныя, пацыенты параўноўваюць іх з зубным болем. Пасля паўдня болі слабеюць, а вечарам яны ўвогуле мала адчуваюцца. Аблягчэнне цягнецца да сярэдзіны ночы, а затым прыступы зноў аднаўляюцца. Для рэўматоіднага артрыту характэрны таксама сімптом ранішняй скаванасці. Хворыя апісваюць яго як адчуванне цесных пальчатак ці цеснага карсета на целе.

Па меры развіцця хваробы ў паталагічны працэс уцягваюцца ўсё новыя суставы, даволі часта запаляюцца калені, локці, галёнкаступнёвыя і плечавыя суставы. Пры гэтым хвароба носіць хвалепадобны характар: перыяды пагаршэння самаадчування змяняюцца перыядамі спантанных паляпшэнняў.

Пасля стрэсу, прастуды ці пераахаладжэння стан хворага можа зноў істотна пагоршыцца. Да таго ж мішэнню рэўматоіднага артырыту з цягам часу могуць стаць лёгкія, сэрца, печань, ныркі, сасуды і кішэчнік. А гэта ўжо пагражае жыццю пацыента. Вось чаму вельмі важна распачаць лячэнне рэўматоіднага артрыту як мага раней, не чакаючы незваротных наступстваў. Хоць вылечыць яго няпроста. Лекавая тэрапія рэўматоіднага артрыту ўключае прымяненне чатырох груп прэпаратаў: гэта нестэроідныя процізапаленчыя прэпараты (яны ліквідуюць толькі сімптомы захворвання), базісныя прэпараты, гармоны і біялагічныя агенты.

Мазі, крэмы, гелі на аснове нестэроідных прэпаратаў (ібупрафен, піраксікам, кетапрафен, дыклафенак) выкарыстоўваюцца ў выглядзе аплікацый на запаленыя суставы. Пры лячэнні рэўматоіднага артрыту прыбягаюць таксама да лазернай тэрапіі, фізіяпрацэдур, лячэбнай фізкультуры і масажу з мэтай ліквідацыі мышачнага спазму і аднаўлення актыўнасці суставаў.

Надзвычай правільна трэба падыходзіць і да харчавання. Хворым, якія пакутуюць на рэўматоідны артрыт, трэба абмежаваць спажыванне таматаў, баклажанаў і ўсіх відаў перцу, якія з'яўляюцца для іх алергенамі. Малако ў рацыёне лепш замяніць малочнакіслымі прадуктамі: ёгуртам, біякефірам, ражанкай, сыраквашай і спажываць іх штодня. Самы карысны прадукт для хворых на артрыт — сыроватка з-пад сыраквашы.

Двойчы на дзень трэба есці салаты з сырой агародніны, здробненай на тарцы з дабаўленнем свежай ці сухой зеляніны. Штодня трэба ўключаць у рацыён ягады і садавіну: асабліва карысныя яблыкі, чорныя парэчкі, журавіны, абляпіха, слівы, абрыкосы, кавуны і вінаград. З супоў рэкамендуюцца толькі вегетарыянскія: з агародніны, гарохавыя, фасолевыя, чачавічныя і грыбныя, лепш з шампіньёнаў.

Народная медыцына ўвогуле раіць вярнуцца да натуральных прадуктаў, якія не прайшлі тэхналагічнай апрацоўкі: выключыць са штодзённага рацыёну ўсе прадукты з белай рафінаванай мукі вышэйшага гатунку, рафінаваныя крупы, а таксама рафінаваны цукар і розныя салодкасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Твае правы

# ЯК ПРЫМУСІЦЬ ПРАДАЎЦА ПРЫНЯЦЬ ПРЭТЭНЗІЮ?

**Чытачка «Звязды» набыла на рынку ў Салігорску акумулятарную батарэю да свайго мабільнага тэлефона. Пры пакупцы прадавец, прыклаўшы пэўныя намаганні, паставіў яе ў тэлефон. Акумулятарная батарэя працавала. На пакупку быў аформлены гарантыйны талон на 90 дзён. Аднак дома, калі дзяўчына паставіла тэлефон на падзарадку, праз некалькі гадзін выбухнула батарэя. Мабільны тэлефон быў сапсаваны. Пакупніца зноў звярнулася ў гандлёвы пункт з заявай аб кампенсацыі шкоды. Аднак гаспадар гандлёвага пункта катэгарычна адмовіўся прыняць яе заяву, патрабаваў найперш даць пісьмовую згоду на аплату кошту экспертызы ў тым выпадку, калі высветліцца, што батарэя была якасная. А гэта, між іншым, 70 долараў плюс кошт дарогі ў два бакі. Чытачка звярнулася ў мясцовае таварыства па абароне правоў спажыўцоў, дзе ёй патлумачылі, што патрабаванне прадаўца — незаконнае. Да завяршэння гарантыйнага тэрміну на тавар прадавец абавязаны рабіць экспертызу тавару за свой кошт. А пакупнік не павінен несці за экспертызу матэрыяльнай адказнасці. У тым выпадку, калі падчас экспертызы будзе даказана невінаватасць прадаўца ў нанясенні шкоды пакупніку, то прадаўцу нічога кампенсаваць не давядзецца. Але і перакладаць аплату экспертызы на спажыўца ён не мае права. Аднак гэты аргумент гаспадара гандлёвага пункта ўсё роўна не пераканаў. Той упарта спасылаўся на нейкае Палажэнне № 1303, якое, па яго словах, у выпадку невінаватасці прадаўца, вызваляе яго ад выдаткаў за экспертызу і перакладае гэты абавязак на спажыўца. Аднак паказаць згаданы дакумент гаспадар гандлёвага пункта не змог. І зарэгістраваць заяву катэгарычна адмовіўся. І як у гэтай сітуацыі пакупніцы адстаяць свае інтарэсы? Хто мае рацыю: таварыства па абароне спажыўцоў ці магазін? Як прымусіць магазін прыняць прэтэнзію і вярнуць свае грошы, у тым ліку і за сапсаваны тэлефон, які не падлягае рамонту?**

— Ну, па-першае, прадавец не мае ніякага права прымушаць пакупніка падпісвацца пад нейкім дакументам, які стане для прадаўца гарантыяй кампенсацыі яму з боку спажыўца грошай за праведзеную экспертызу, — патлумачыла нашай газеце **кансультант упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Антаніна ПАЛЯКОВА.** — Палажэння, на якое спасылаўся ўласнік магазіна, проста не існуе. Усе гэтыя пытанні рэгулююцца Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў». Але вашу чытачку ўсё ж такі крыху заблыталі ў арганізацыі абароны спажыўцоў, ці яна не да канца зразумела пачутую там інфармацыю.

Згодна з артыкулам 19 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», пры ўзнікненні спрэчкі аб прычынах узнікнення недахопаў тавару прадавец абавязаны правесці экспертызу тавару за свой кошт. Пра месца і час правядзення экспертызы спажыўцу павінна быць паведамлена ў пісьмовай форме. Спажывец мае права ўдзельнічаць у праверцы якасці тавару асабіста ці праз свайго прадстаўніка, а таксама мае права аспрэчваць заключэнне такой экспертызы ў судовым парадку.

Кошт экспертызы, як я ўжо казала раней, аплачваецца прадаўцом. Аднак калі ў выніку экспертызы будзе ўстаноўлена, што недахопы ўзніклі пасля продажу тавару спажыўцу, напрыклад, у выніку парушэння ўстаноўленых правілаў выкарыстання, захоўвання ці транспарціроўкі, спажывец будзе абавязаны кампенсаваць прадаўцу выдаткі на правядзенне экспертызы, а таксама звязаныя з яе правядзеннем выдаткі на транспарціроўку тавару. І нават калі на тавар дзейнічае гарантыя, але той быў сапсаваны пакупніком пасля яго продажу, то пакупніку давядзецца кампенсаваць прадаўцу кошт праведзенай экспертызы.

Калі прадавец адмаўляецца прыняць у пакупніка прэтэнзію, той можа адправіць яе па пошце заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні на юрыдычны адрас прадаўца. Для гэтага трэба дакладна ведаць найменне той арганізацыі, у якой спажывец набыў тавар неналежнай якасці, і яе юрыдычны адрас. Юрыдычны адрас арганізацыі можа супадаць з адрасам магазіна ці філіяла. Але некаторыя гандлёвыя арганізацыі маюць некалькі магазінаў і ва ўсіх іх — адзін юрыдычны адрас. Інфармацыю аб юрыдычным адрасе можна знайсці ў ліцэнзіі на гандлёвую дзейнасць, копіі якой павінны быць у кожным гандлёвым пункце. Таксама даведацца юрыдычны адрас можна ў адміністрацыі рынку, на тэрыторыі якога дзейнічае гэты суб'ект гаспадарання.

Ёсць яшчэ адзін (самы просты) спосаб прымусіць прадаўца прыслухацца да сябе — занатаваць сваю прэтэнзію ў Кнізе заўваг і прапаноў, якая павінна знаходзіцца ў кожным гандлёвым аб'екце. У тым жа выпадку, калі прэтэнзія спажыўца засталася без разгляду ці яе вынікі не задавальняюць спажыўца, ён можа звярнуцца да ўпаўнаважаных па абароне правоў спажыўцоў, якія ёсць у структуры кожнага аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама, кожнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Калі спрэчную сітуацыю не атрымліваецца вырашыць у дасудовым парадку, то можна звярнуцца ў суд. Іскавую заяву дапамогуць аформіць у мясцовых выканаўчых і распарадчых органах ці ў таварыстве па абароне спажыўцоў. У любым выпадку пажадана пакінуць сабе копію прэтэнзіі на той выпадак, калі прадавец не задаволіць вашы патрабаванні або задаволіць іх толькі часткова. Копія прэтэнзіі, а таксама дакументы якія пацвярджаюць факт атрымання прадаўцом прэтэнзіі, могуць спатрэбіцца пры звароце ў суд.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ёсць праблема

# ЦІ ДАПАМОЖА ТОЙ, ХТО МОЖА?

**Толькі сёмая сядзелка, якую па аб'явах шукала Ірына*, аказалася прыстойнай жанчынай. Да гэтага было ўсякае. Адна збівала 80-гадовага дзядулю, другая крала прадукты. Іншага выйсця, як звяртацца да чужых людзей, у Ірыны няма. Сама даглядаць бацьку яна не можа. Да сваёй чаргі ў псіханеўралагічны інтэрнат бацька Ірыны можа і не дажыць — чарга на пяць гадоў. Застаецца толькі ісці на рызыку, давараючы чужым людзям свайго роднага чалавека.**



## Праца за 400 тысяч

Пра пашырэнне спектра паслуг сацыяльных службаў беларускія СМІ пачалі гаварыць яшчэ ў чэрвені 2006-га. Менавіта тады прафесія сядзелкі была ўнесена ў Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад служачых. Па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Валяр'яна Караля, штатная пасада сядзелкі будзе ўведзена ў кожным тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання.

На сёння з 9 раённых цэнтраў сацыяльнай абароны насельніцтву горада Мінска служба сядзелак рэальна працуе толькі ў Першамайскім раёне. Паслуга тут каштуе 5240 рублёў за гадзіну, але сядзелка з гэтых грошай атрымлівае менш за палову — 2000. Менавіта на такіх умовах бяруць на працу ў Першамайскім раёне. Пры працоўным дні ў 8 гадзін заробак складзе каля 330 000 за месяц; калі без выхадных, то на 130 тыс. больш.

Службу сядзелак у Маскоўскім раёне, як і ў Партызанскім, Фрунзенскім, стварылі б ужо даўно, але вакансіі так і застаюцца адкрытымі.

— Як толькі чалавек даведваецца, што яму патрэбна рабіць і колькі за гэта плаціць, размова аб уладкаванні далей звычайна не працягваецца, — гаворыць Вольга Петрашэвіч, загадчыца аддзела тэрміновай сацыяльнай дапамогі. — Вакансія сацпрацаўніка ў нас вісіць пастаянна. Ды што тут казаць, калі наша Ірына Іванаўна працуе вось ужо 13 гадоў, а зарабляе 400 000. Тут галоўная праблема з кадрамі, і вырашыць яе з даплатай, якую мы атрымліваем з грамадзян, практычна немагчыма.

**Вольга Петрашэвіч, загадчыца аддзела тэрміновай сацыяльнай дапамогі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай дапамогі Маскоўскага раёна аб праблеме з сядзелкамі: «Як толькі чалавек даведваецца, што яму патрэбна рабіць і колькі за гэта плаціць, размова аб уладкаванні далей звычайна не працягваецца».**

Як альтэрнатыва, у цэнтрах сацыяльнай абароны ёсць пагадзінны хатні догляд коштам 1070 рублёў за гадзіну. Паслуга заказваецца не менш як на дзве гадзіны і ўключае падагрэў ежы, кармленне, змену памперсаў, падачу судна. У прынцыпе, тая ж сядзелка, але толькі на дзень і наўрад ці на ўвесь. Таму што сацыяльныя працаўнікі аказваюць, апроч гэтай паслугі, яшчэ шмат іншых (суправаджэнне ў паліклініку, хатнія ўборкі і г.д). Як расказалі мне ў Заводскім раёне, цяпер з трох чалавек у іх працуе толькі адзін. Адправіць яго на пагадзінны догляд на ўвесь дзень да некага аднаго, — значыць пазбавіць дапамогі іншых.

Для Ірыны скарыстацца паслугай пагадзіннага хатняга догляду таксама праблематычна. Яе бацька пакутуе ад хранічнага псіхічнага захворвання. На абслугоўванне такіх людзей звычайна не бяруць з-за выпадкаў нападу на сацпрацаўнікоў.

— За адной нашай працаўніцай ганяліся з нажом. Другой хацелі паказаць, куды хірургі ўставілі катэтар, — расказвае Вольга Аляксандраўна.

Калі ў цэнтры Маскоўскага раёна не могуць дапамагчы, даюць кантакты Фонду міласэрнасці і здароўя. Ірына таксама звярталася ў Фонд, але паслугі сядзелак там каштуюць, па яе прызнанні, вельмі дорага. Адна гадзіна працы сядзелкі — каля 5200 рублёў. А гэта 124 000 рублёў у суткі.



## Сядзелка-«эсэсаўка»

Ірына пачала самастойныя пошукі. Спярша яна дала аб'яву ў газету.

— Тэлефанаванняў было вельмі шмат. Нават мужчыны. Варыянт з мужчынам-сядзелкай мне адразу не спадабаўся, насцярожыў. Хто ідзе ў сядзелкі? Я маю на ўвазе з працаздольных? Той, хто не можа ўладкавацца на нармальную працу.

Пошукі былі доўгія. Сядзелкі з медадукацыяй заламвалі непад'ёмны кошт, і звычайна не маглі даглядаць 24 гадзіны. Ім патрэбна была толькі падпрацоўка.

Сядзелак для дзядулі мы наймаем на ўмовах нашага харчавання і пражывання. Прадукты падвозім пастаянна...

У асноўным працавалі ў нас жанчыны-пенсіянеркі. Ой, столькі іх у нас было за два гады, і столькі гора нацярпеліся... Мы нават мянушкі ім давалі. Была адна «эсэсаўка». Прагналі яе так з-за жорсткага абыходжання з дзядулем. Справа ў тым, што мой бацька мае асобную кватэру. І таму сядзелка жыве з ім. Наша сям'я — асобна. Пару разоў здаралася, што мы прыязджаем — а ён увесь у сіняках. То бок, то рука, — яна яго збівала. Была адна, якая крала прадукты і такім чынам карміла за наш кошт усю сваю сям'ю.

Абараніцца ад такіх выпадкаў на законнай падставе Ірына не можа. Юрыдычна заключыць дамову з сядзелкай з аб'явы яна не мае права, пакуль яны абодва з'яўляюцца фізічнымі асобамі. Паслугі сядзелкі ў адпаведнасці з заканадаўствам лічацца дзейнасцю з мэтай атрымання прыбытку. І таму, каб іх аказваць, патрэбна зарэгістравацца ў якасці прыватнага прадпрымальніка. А гэта азначае плату падаткаў і большую адказнасць.

**Ірына, настаўніца: «Была ў нас адна «эсэсаўка». Мы яе так прагналі з-за жорсткага абыходжання з нашым дзядулем. Пару разоў было такое: мы прыязджаем — а ён увесь у сіняках. Яна яго збівала».**

Перастрахавацца можна, калі звярнуцца ў агенцтва. Яно знаходзіць вам сядзелку і плаціць ёй заработную плату, а вы ўжо плаціце агенцтву. Гэта страхуе вас ад ашуканцаў. У Мінску агенцтваў няшмат. І цэны ў іх даволі кусачыя. Паслугі сядзелкі тут будуць каштаваць 500 у.а. у месяц (адзін выхадны ў тыдзень) плюс даплата за пошук як мінімум 170 тыс. рублёў і гарантыя замены непадыходзячай кандыдатуры.

— Зараз мы плацім сядзелцы 450 у.а. у месяц. Цягнем з апошніх сілаў. Агенцтвы дзяруць непад'ёмныя сумы. Мне з настаўніцкай зарплатай, ды мужу, які таксама ў бюджэтнай сферы працуе, іх не знайсці, — тлумачыць Ірына нежаданне звяртацца да пасрэднікаў.

## Сесці на шыю падаткаплацельшчыкаў?

Ёсць яшчэ варыянт — самой стаць сядзелкай для бацькі. Тым больш што пастановай Савета Міністраў ад 6 верасня 2006 г. №1149 «Аб дапамозе па доглядзе інваліда I групы альбо асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту» для Ірыны прадугледжана матэрыяльная дапамога. Але тут ёсць свае нюансы. Па-першае, асоба, якая прэтэндуе на матэрыяльную дапамогу, павінна быць беспрацоўнай, не займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не вучыцца ў навучальных установах дзённай формы атрымання адукацыі, не атрымліваць пенсій, дапамогі па беспрацоўі, штомесячнай страхавой выплаты ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, штомесячнага грашовага ўтрымання ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе. І толькі тады яна можа атрымаць дапамогу ў памеры 65 працэнтаў, а пры ажыццяўленні адначасовага догляду двух і больш непрацаздольных грамадзян — у памеры 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. Менавіта так прапісана ў пастанове. Дарэчы, памер дапамогі павялічыўся сёлета са жніўня. Раней ён складаў 25 і 50 працэнтаў БПМ адпаведна. Цяпер — 146 055 і 224 700 рублёў адпаведна. Але для Ірыны такі варыянт непрымальны.

— Ці магчыма цяпер на такія грошы пражыць мне ў Мінску? Дапамога мізэрная і пры гэтым я не павінна працаваць, а ўвесь час сядзець са сваім бацькам... А якая пенсія выйдзе ў мяне, калі я буду атрымліваць 146 тысяч?

Пра спецыялізаваны дом-інтэрнат Ірына зараз і не думае. Па-першае, легальным спосабам у яго можна патрапіць толькі праз пяць гадоў. А пасля таго, як яна наведалася ў адзін інтэрнат і ўбачыла стаўленне да хворых, магчымасць тым ці іншым спосабам уладкаваць бацьку была забытая.

Самы аптымальны варыянт вырашэння праблемы Ірына бачыць у стварэнні ўстановы кшталту дзіцячага садка. Куды зранку можна было б прывезці бацьку, а ўвечары забраць. Ці спецыяльнай гасцініцы для людзей з такімі захворваннямі. Але, паводле яе меркавання, гэта ў нашай краіне магчыма толькі на прыватнай аснове.

— Значыць, і кошты, згодна з сённяшнімі рэаліямі, будуць непад'ёмнымі, — уздыхае яна.

**Настасся ЗАНЬКО.**

* Прозвішча не ўказана па просьбе гераіні.

POSTfactum

## Конкурс па паяданні піцы: хто хутчэй!

**Жыхар амерыканскага штата Каліфорнія выйграў чэмпіянат па паяданні піцы на хуткасць, які прайшоў у нядзелю на Таймс-сквер у Нью-Ёрку, паведамляе агенцтва АР. Нейкаму Джоі Чэстнату ўдалося з'есці 45 кавалкаў піцы за 10 хвілін.**

Пераможца прызнаўся, што рыхтуючыся да чэмпіянату, не еў больш чым суткі. Для паскарэння працэсу паядання піцы, расказвае Чэстнат, ён згортваў кавалкі ў трубачку.

Джоі Чэстнат — неаднаразовы пераможца конкурсаў па паглынанні фаст-фуда на хуткасць. Так, у 2007 годзе ён выйграў спаборніцтва па паяданні хот-догаў, якія таксама праводзіліся ў Нью-Ёрку. У ліпені 2008 года містар Чэстнат ізноў стаў пераможцам гэтага ж конкурсу, з'еўшы за 10 хвілін 59 сасісак у булцы. У верасні 2008 года Чэстнат выйграў конкурс па паяданні гамбургераў, які праводзіўся ў штаце Тэнэсі, з'еўшы 93 бутэрброды за 8 хвілін.

## Раўнівы муж пратрымаў сваю жонку пад замком 50 гадоў

**Аб гэтым незвычайным факце стала вядома літаральна днямі, піша англійская газета «Тэлеграф». Жанчына з італьянскага горада Трэнта паведаміла аб гэтым урачам адной з бальніц, куды яе шпіталізавалі са скаргамі на боль у сэрцы. Урачы патэлефанавалі ў паліцыю і выклікалі пракурора.**

Пара пажанілася ў 1958 годзе, і на працягу наступных 50 гадоў муж не дазваляў сваёй жонцы мець стасункі з кімсьці, акрамя яго. 70-гадовая жанчына расказала, што муж не дазваляў ёй выходзіць з дому, бачыцца з дзецьмі, калі яны выраслі і пакінулі родны дом, і нават глядзець тэлевізар. Калі муж недзе выходзіў, ён зачыняў дзверы і вокны, каб жонка не змагла выйсці на двор.

Пракурор горада Трэнта аформіў распараджэнне, згодна з якім падчас вядзення расследавання раўнівы муж будзе жыць асобна ад жонкі.

## На Алтаі ўведзены каменданцкі час. З-за нашэсця мядзведзяў

**У сувязі з масавым нашэсцем галодных мядзведзяў у двух пасёлках Рэспублікі Алтай мясцовыя ўлады прынялі беспрэцэдэнтнае рашэнне ўвесці каменданцкі час. Днём жыхарам дазволена перамяшчацца за межамі пасёлкаў толькі ў суправаджэнні ўзброенай аховы, а з наступленнем цемры і да світання катэгарычна забаронена пакідаць дамы, паведамляе ІТАР-ТАСС.**



Пасёлкі Яйлю і Беле Турачакскага раёна размешчаны на тэрыторыі Алтайскага дзяржаўнага прыроднага запаведніка, аднаго з самых вялікіх у Расіі. Звяры гаспадараць тут ужо больш як 20 дзён: за гэты час у пасёлках пабывала каля 30 мядзведзяў.

Дзясяткі мядзведзяў у пошуках ежы здзяйсняюць набегі на фруктовыя сады і падворкі. Галодныя звяры ўначы, а часам нават і днём ламаюць платы, залазяць у куратнікі і адрыны, нападаюць на свойскіх жывёл. Не рэагуючы на крыкі і нават стрэлы, жывёлы «ачысцілі» ад яблыкаў і груш больш як дзесяць гектараў мясцовых садоў. Як паведаміла намеснік дырэктара запаведніка Святлана Чухонцава, «восеньскае нашэсце мядзведзяў выклікана неўраджаем у тайзе — у лясах зніклі кедравыя арэхі і ягады — асноўныя складнікі рацыёну касалапых».

Сёння адбудзецца нарада кіраўнікоў запаведнікаў і прыродных паркаў, дзе будзе ўзнята пытанне аб адстрэле звяроў.

## Ізраільскага араба-праваабаронцу арыштавалі ў аэрапорце за адмову зняць штаны

**Прадстаўнік грамадскай арганізацыі «Гавлеовед» ізраільскі адвакат арабскага паходжання Халід Духі быў затрыманы ў тэль-авіўскім аэрапорце пасля таго, як адмовіўся прайсці працэдуру праверкі. Ён не захацеў зняць штаны, паведамляюць мясцовыя СМІ.**

Паводле слоў адваката, ён ляцеў унутраным рэйсам у горад Эйлат, дзе павінен быў дапамагчы бежанцам з Судана, якія працуюць там, вырашыць працоўны канфлікт з уладальнікамі гасцініц. У аэрапорце пры праверцы Духі «зазвінеў». Ахова папрасіла яго зняць штаны, для таго, каб правесці больш дасканальную праверку. Х. Духі адказаў, што хутчэй пакіне будынак аэрапорта, чым зробіць гэта. Ахова выклікала паліцыю, якая Духі арыштавала і абшукала.

Пасля завяршэння працэдуры адвакат быў вызвалены, праўда, яго самалёт паляцеў за тры гадзіны да гэтага. Ізраільскі Арабскі цэнтр абароны правоў чалавека «Масава» мае намер падаць скаргу на дзеянні авіякампаніі El Al і ўпраўленне авіяцыі, якія, па меркаванні праваабаронцаў, займаюцца дыскрымінацыяй арабскіх грамадзян Ізраіля.

*Паважанага бацьку, дзядулю, прадзеда* ***Міхаіла Васільевіча САДОЎНІЧАГА*** *з Дзяржынска віншуем з 94-годдзем! Моцнага здароўя, бадзёрага настрою і дажыць да 100-гадовага юбілею!*

*Гордимся, любим, поздравляем*
*И дружно всей семьей желаем:*
*Пусть бодрость*
*сохранится навсегда*
*И жизнь продлится долгие года!*

***З павагай усе родныя.***

У **суд Фрунзенскага раёна г. Мінска** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Свекатун (да замужжа Ладуцька) Ірыны Васільеўны**, 18 ліпеня 1975 года нараджэння, ураджэнкі г. Асіповічы Магілёўскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Мінск, вул. Адзінцова, 23-1-383.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Свекатун Ірыну Васільеўну, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым грамадзяніна **Ратоша Мікалая Анатольевіча**, 19 снежня 1959 года нараджэння, які пражываў у г. Рэчыцы Гомельскай вобласці, па вул. Гастэла, 17.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Ратоша Мікалая Анатольевіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 29 (597)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

❐ Участак 1 га, 40 км ад Мінска, маецца вада, электрычнасць, тэлефон, недалёка рака.
Тэл. 8 01776 55 119.

❐ Дом у г. Асіповічы ці мяняю на Мінск з даплатай, магчымыя варыянты.
Тэл. 8 029 648 21 30.

❐ Воз на гумавых колах, плуг, збруя.
Тэл. 8 01794 46 235.

❐ Дом 6 х 8, можна пад знос, у в. Галынь Навагрудскага раёна.
Тэл.: 8 01597 71 479, 253 35 69.

❐ Катэдж 2-павярховы (газ, вада) каля р. Нёман, 40 км ад Ліды, ёсць сад, агарод. 18 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889 95 10.

❐ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца гараж, у райцэнтры Гарадок.
Тэл.: 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

❐ Кватэра 2-пакаёвая ў в. Станькава Дзяржынскага раёна, 40 км ад Мінска.
Тэл. 854 00 99.

❐ Млын-драбілка, 380 В, 4,0 кВт, гароднінарэзка 380 В, 2,2 кВт.
Тэл. 8 029 133 97 24.

❐ «Аўдзі» (кузаў Б-4 «авант»), 1995 г.в., 1,6 бензін.
Тэл.: 8 029 650 17 39, 8 029 767 13 45.

❐ Карабельны гадзіннік вытворчасці СССР.
Тэл.: 8 022 356 68 52, 8 029 248 86 10.

❐ Трактар МТЗ-52, задні мост Т-40, прычэп 2ПТС-4.
Тэл. 8 029 648 21 30.

❐ А/шыны «Матадор» летнія R14, 4 шт.
Тэл. 8 029 873 47 07.

❐ Козы маладыя і дойныя, матаблок, швейная машынка «Орша».
Тэл. 8 01779 46 738.

❐ Кабан у г. Валожыне.
Тэл. 8 029 153 97 46.

❐ Вось з калёсамі, новая, да прычэпа «Зубраня» і прычапное прыстасаванне.
Тэл. 8 01770 65 507.

### КУПЛЮ

❐ «Аўдзі» ці «VW» з 1988 па 2005 г.в., можна з невялікімі дэфектамі, разгледжу любыя варыянты.
Тэл. 8 029 145 11 97, 8 029 771 51 78.

❐ Куплю трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

❐ Старадаўнія ўзнагароды, манеты, знакі ваенных навучальных устаноў і інш.
Тэл. 8 029 553 43 66.

### РОЗНАЕ

❐ Здыму пакой, 2-пакаёвую кватэру ў Мінску.
Тэл.: 8 01595 26 244, 8 029 912 97 67.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Пашпарт серыя ____________ № ____________ Выданы ____________

Подпіс ____________ Дата ____________

## Усміхнёмся!

**Муж сядзіць за камп'ютарам, працуе. Жонка ходзіць побач, просіцца ў інтэрнэт. Муж:**

**— Ну паспрабуй знайсці сабе які-небудзь іншы занятак.**

**— Ну як я магу знайсці нешта іншае, калі дзве мае любімыя цацкі — камп'ютар і муж — гуляюць адзін з другім?**

☺

Завылі сірэны — міма зноў праплываў Адысей...

☺

**Бацька рыхтуе маленькага сыночка да чаканага прыбаўлення сямейства:**

**— Вовачка, ты хочаш мець маленькага брацікa або сястрычку?**

**— Нават калі б не хацеў, — адказвае той, — ужо ўсё роўна позна.**

☺

Мне ўчора жонка кажа: «Пайдзі пагуляй з сабакам». Ну мы з Шарыкам і пагулялі... на 300 баксаў.

☺

**Дзве сяброўкі:**

**— Уяўляеш, пазнаёмілася з хірургам і ён прапанаваў мне руку і сэрца.**

**— Ды ты што? І што далей?**

**— Ну што, што... Прынёс...**



## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.36 | 18.14 | 10.38 |
| Віцебск — | 7.28 | 18.02 | 10.34 |
| Магілёў — | 7.26 | 18.04 | 10.38 |
| Гомель — | 7.20 | 18.03 | 10.43 |
| Гродна — | 7.51 | 18.30 | 10.39 |
| Брэст — | 7.49 | 18.32 | 10.43 |

**Месяц**

*Першая квадра.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

***Пр.*** *ПАКРОВЫ (ПАКРОЎ МАЦІ БОЖАЙ), Аляксандра, Анастасіі, Георгія, Міхаіла, Рамана, Савы.*
***К.*** *Маргарыты, Бярнарда, Калікста.*

## НАДВОР'Е на заўтра




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +13..+15°С | КІЕЎ +14..+16°С | РЫГА +12..+14°С |
| ВІЛЬНЮС +12..+14°С | МАСКВА +9..+11°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°С |

## 14 кастрычніка

Дзве даты

**1899 год** — у вёсцы Слабада-Кучынка Капыльскага раёна нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік і крытык Адам Бабарэка, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». Адстойваў правы маладых літаратараў на вольнае творчае самавыяўленне. Яго прагрэсіўныя погляды выклікалі хвалю неабгрунтаваных абвінавачванняў з боку вульгарнай крытыкі. У ліпені 1930 года пісьменнік быў арыштаваны і 8 апошніх гадоў жыцця правёў у ссылцы.



**1964 год** — кастрычніцкі пленум ЦК КПСС зняў з усіх партыйных і дзяржаўных пасадаў Мікіту Хрушчова і абраў першым сакратаром ЦК партыі Леаніда Брэжнева.

Цытата дня:

*«Разумны чалавек не толькі не скажа нічога дурнога, але нават ніколі не пачуе нічога дурнога».*

**Людвіг Бёрне (1786—1837), нямецкі публіцыст.**

## ПАКРОЎ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ І ПРЫСНАДЗЕВЫ МАРЫІ

Свет і сусвет чалавека

**Адно з найбольш шанаваных святаў Праваслаўнай Царквы. У X стагоддзі ў Влахернскай царкве Канстанцінопаля, куды ў V стагоддзі з Палесціны былі перанесены рыза Багародзіцы, яе галаўны ўбор (мафорый, амафор, пакрывала ад галавы да ног) і частка пояса, цудоўна з'явілася сама Багародзіца. У гэты час ішла жорсткая вайна, сарацыны забівалі вернікаў. Не маючы дастатковай магчымасці супрацьстаяць захопнікам, жыхары Канстанцінопаля з малітвай звярнуліся да Багародзіцы. У нядзелю, падчас літургіі, святы Андрэй, у гонар Хрыста юродзівы, паглядзеў на неба і ўбачыў, як па паветры ідзе Прачыстая Дзева. Яна ззяла нябесным святлом і ішла ў суправаджэнні анёлаў і святых. Прачыстая Дзева пачала слёзна маліцца за хрысціян аб вызваленні ад ворагаў. Калі Марыя падышла да прастолу, яна зняла са сваёй галавы пакрывала і распасцёрла яго над усімі прысутнымі ў храме. Пакрывала ў яе руках ззяла «ярчэй за сонечныя прамяні». Дзякуючы заступніцтву Прачыстай Дзевы вораг пакінуў тэрыторыю, прылеглую да Канстанцінопаля. Сярод усходніх славян свята Пакроў Боскай Маці святкуецца з сярэдзіны XII стагоддзя. У гонар Пакрова Боскай Маці будаваліся храмы, пісалі абразы.**

● У народзе дзень Пакрова Прасвятой Багародзіцы атрымаў таксама сімвалічны змест: снег, які выпадаў у гэты дзень, называлі «снежным покрывам» зямлі, а значыць, неабходна было скончыць усе сельскагаспадарчыя работы: «Прыйшлі Пакровы, пытаюць, ці да зімы гатовы», «Хто сее на Пакровы, не будзе мець чаго даць карове».

● Пакровы — першы надыход маразоў, холаду, снегу, прымаразкаў — своеасаблівая мяжа паміж восенню і зімой.

● У Беларусі і сёння свята ўшаноўваюць залатое правіла народнай культуры — пасля Пакроваў нельга кранаць зямлю: «Не чапай зямлю да Радаўніцы і пасля Пакроваў, смерць будзе ў тваім родзе». Казалі так: «На Пакроў зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю, і пасля гэтага дня да вясны ніхто не можа яе чапаць». Асабліва гэта тычыцца закладкі фундаменту, будаўніцтва агароджы, тыноў, усталявання помнікаў на могілках.

● Пакровы традыцыйна лічацца «ахоўным» (спрыяльным) часам для вяселляў. З гэтага дня пачынаюцца так званыя «восеньскія вяселлі»: «Пакровы і зямлю, і дзеўку пакрыюць», «Бацюшка Пакроў, пакрый зямлю сняжком, а мяне маладу — жанішком».

● Пакрытая галава здавён была прыкметай замужняй жанчыны: дзяўчаты хадзілі з непакрытай галавой, а замужнія жанчыны павінны былі мець галаўны ўбор.

● Калі на Пакровы ідзе снег, гэта прадказвала вялікую колькасць вяселляў. Казалі: «Прыйдуць Пакровы дзяўчыне галаву пакрыць», а «Не пакрылі Пакровы, не пакрые і Раство». Так у народнай свядомасці аб'ядналіся амафор Багародзіцы, снежны пакроў зямлі і вясельнае ўбранне нявесты — вэлюм.

● Дзяўчаты, якія верылі ў сілу свята Пакроваў, іх здольнасць пасадзейнічаць шлюбу, раніцай ішлі ў царкву, запальвалі свечку перад абразом Дзевы Марыі і казалі:

«Пакроў пакрыў зямлю снегам, раку лёдам, рыбу луской, а мяне чапцом (вэлюмам) пакрой». Існавала павер'е: хто раней запаліць свечку, той раней возьме шлюб.

● З 14 кастрычніка паўсюдна пачыналіся Пакроўскія кірмашы.

● У гэты дзень абавязкова пяклі бліны. Лічыліся, што дзякуючы гэтаму сям'я ўдала паразімуе. Гэты абрад так і звалі — «запякаць вуглы», гэта значыць зберагчы, захаваць сям'ю, хату, гаспадарку.

● Свята Пакровы было даволі вызначальным для стану надвор'я, асабліва для зімовага перыяду. Давайце назіраць і разважаць разам з нашымі продкамі:

Якія Пакровы, такая і зіма.

На Пакровы да абеду восень, па абедзе — зіма.

Калі снег да Пакроваў пойдзе — зіма будзе не хутка.

Калі жоравы адляцяць да Пакравоў — зіма будзе ранняя і халодная.

Калі лісце з дуба і бярозы на Пакровы ападзе чыста — да лёгкага года, а не ападзе — да суровай зімы.

Ад першага снегу да саннага шляху шэсць тыдняў.

Калі да Пакрова дня снег не пакрыў зямлю — на Каляды не будзе снегу.

Якая пагода на Пакровы, такая і на Раства.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5647. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# АДЧУВАННЕ ПАЛЁТУ

**Найбольш значным праектам наступнага года ў фармацэўтычнай галіне Беларусі спецыялісты называюць завяршэнне рэканструкцыі вытворчасці інфузійных раствораў на РУП «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў», дзе ўкараняецца тэхналогія Bottlepack, якая не мае аналагаў у Беларусі. Гэта — выдзьмуванне, разліў і запайка стэрыльных раствораў у поліэтыленавых бутэльках за адзін тэхналагічны цыкл. Сёлета ўжо ўведзена ў эксплуатацыю першая лінія па вытворчасці новай прадукцыі магутнасцю 5 млн бутэлек па 250 і 500 мл у год. Да канца года плануецца закупка яшчэ адной падобнай лініі. Гэта дазволіць забяспечыць установы аховы здароўя краіны інфузійнымі растворамі ў сучаснай упакоўцы, а таксама пашырыць геаграфію экспартных паставак.**

## Нясвіжскі завод медпрэпаратаў наблізіўся да сусветных стандартаў якасці






**Сяргей ПРАСМЫЦКІ** ўзначаліў Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў два гады таму. Час, у які новы дырэктар прыйшоў на завод, быў няпросты: перад прадпрыемствам стаяла задача рэканструкцыі вытворчасці інфузійных раствораў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі Належнай вытворчай практыкі (Good manufacturing practice — GMP) і ўкаранення тэхналогій, аналагаў якіх у Беларусі няма. Напэўна, пачынаць новае чалавеку новаму ў некаторым сэнсе лягчэй. Аднак гэта ўсё роўна, што выклікаць агонь на сябе: на такое здольны не кожны. І выпрабаванні трываласцю не прымусілі сябе чакаць. Напрыканцы мінулага года прадпрыемства сутыкнулася з праблемай вострага дэфіцыту абаротных сродкаў, бо, з аднаго боку, запуск новага цэха патрабаваў вялізных фінансавых і чалавечых выдаткаў, з іншага — узнікні праблемы з рэалізацыяй прадукцыі. Аднак прадпрыемству ўдалося пераадолець крызіс і цяпер яно ўпэўнена выходзіць на «ўзлётную» паласу.

**Віншую калектыў прадпрыемства і ўсіх калег з прафесійным святам — Днём работніка фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці!**

Жадаю самага галоўнага багацця ў жыцці — здароўя, шчасця, дабрабыту, невычэрпнай энергіі і ініцыятывы ва ўсіх пачынаннях! Жадаю ўсім плённай працы і фінансавай стабільнасці!

***Дырэктар РУП «Нясвіжскі завод медпрэпаратаў» Сяргей Прасмыцкі.***



*Галоўны інжынер Наталля МАРКАЧЭЎСКАЯ дасканала ведае ўсе звёны новай вытворчасці.*

## Інтэрв'ю з кіраўніком

**— Якія на сёння «сігнальныя агні» завод перасягнуў?**

— Па-першае, прадпрыемства выйшла з фінансавага крызісу, які пераžываla напрыканцы мінулага года. Другое — мы закончылі будаўніцтва цэха па вытворчасці раствораў у поліэтыленавай тары. Сёння мы ўжо маем рэгістрацыю Рэспублікі Беларусь на новую прадукцыю: раствор натрыю хларыду 0,9-працэнтны, растворы глюкозы пяціпрацэнтны і дзесяціпрацэнтны і ін'екцыйную ваду. Мы выйшлі на якасна новы ўзровень не толькі ў тэхналогіі, але і ў культуры вытворчасці, тэхнікі бяспекі. Акрамя таго, мы прайшлі сертыфікацыю па стандарце СТБ ISO-18000, і цяпер на заводзе дзейнічае сістэма па ахове працы і экалогіі, якая адпавядае міжнародным стандартам. У наступным годзе мы плануем атрымаць міжнародны сертыфікат GMP або Good manufacturing practice — «Належная вытворчая практыка» лекавых сродкаў — гэта пацвярджэнне адпаведнасці агульнаеўрапейскім нормам вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі. Стандарты вытворчага працэсу GMP уключаюць мноства складнікаў — плошча і абсталяванне цэха, кваліфікацыя персаналу, спосаб ачысткі паветра, кантроль якасці, спецвопратка... Сертыфікат GMP — свайго роду гарантыя якасці нашай прадукцыі, ён дазволіць выйсці на фармацэўтычныя рынкі іншых краін па спрошчаных працэдурах рэгістрацыі, а таксама стаць пераможцамі тэндэраў на закупкі.

**— Што дапамагло змагчы пераадолець крызіс?**

— Удзел у яго пераадоленні ўзялі канцэрн «Белбіяфарм» і асабіста віцэ-прэм'ер краіны Аляксандр Косінец. Згодна з пратаколам-даручэннем апошняга нам быў выдзелены дадатковы крэдыт. Зрушылася сітуацыя з рэалізацыяй. Яшчэ чатыры гады таму, калі пачынаўся праект па рэканструкцыі Нясвіжскага завода медпрэпаратаў, на Калегіі Міністэрства аховы здароўя было прынятае рашэнне аб забароне разліву інфузійных раствораў унутры бальніц і аптэк і аб выкарыстоўванні толькі прамысловых раствораў. Аднак рашэнне гэта не выконвалася, пакуль Савет Міністраў не ўзяў пытанне пад свой кантроль. Справа ў тым, што для бальніц і аптэк самастойны разліў раствораў у шкляныя бутэлькі, якія ўжо выкарыстоўваліся, атрымліваецца больш танным, але якасць прадукцыі пры гэтым ніхто і не кантралюе. Калі размова ідзе пра жыццё і здароўе людзей, такое недапушчальна.

У нас не толькі існуе асаблівая падрыхтоўка ін'екцыйнай вады, але ёсць лабараторыя і віварый, дзе прадукцыя правяраецца на таксічнасць і пірагеннасць. Ні ў адной бальніцы няма падобнага. Дзеля таго, каб наша прадукцыя адпавядала патрабаванням стандарту GMP, на прадпрыемстве праведзена дарагая рэканструкцыя, на якую выдаткаваны сродкі бюджэту краіны і крэдыт. Прадукт выведзены на рынак — час вяртаць грошы. Такім чынам праект выходзіць далёка за межы вытворчага і нават галіновага.

**— Якая галоўная задача на сёння?**

— Як мага хутчэй даставіць і запусціць другую лінію разліву. Яна павінна быць прывезена ў пачатку снежня. І нас хвалюе, што час мантажу можа супасці з каляднымі канікуламі ў нашых партнёраў. На сёння заводу выдзелена па Праграме развіцця малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў 11 млрд беларускіх рублёў пад другі і трэці этап рэканструкцыі. Гэта аплата другой чаргі: лінія разліву і ўпакоўкі фірмы «WEILER», новыя склады і лабараторыя, а калі застануцца грошы, плануем зрабіць яшчэ і пральню для падрыхтоўкі тэхналагічнага адзення па нормах GMP. Сёлета мы павінны асвоіць 6,5 млрд беларускіх рублёў, на наступны год — 4,5 млрд.

**— Планы на будучыню гэтым не абмяжоўваюцца?**

— Вядома ж. На плошчах прадпрыемства мы збіраемся праводзіць рэканструкцыю яшчэ аднаго корпуса, ён цяпер не дзейнічае, каб выпрацоўваць там растворы для кансервавання і захоўвання крыві і яе кампанентаў у трохслойных поліэтыленавых упакоўках. Сёння такія прэпараты закупляюцца за мяжой. Прыкладны аб'ём інвестыцый складзе 6,5 млн еўра. Падобнай вытворчасці няма не толькі ў Беларусі, але і на тэрыторыі былога Савецкага Саюза.

Плануем таксама ўсталяваць на тэрыторыі прадпрыемства міні-ЦЭЦ магутнасцю да 4 МВт для забеспячэння вытворчасці цеплавой і электрычнай энергіяй шляхам перапрацоўкі прыроднага газу. Гэта дазволіць знізіць выдаткі на цяпло і электрычнасць, якія спажываюцца.

Да 2011 года маем намер завяршыць рэканструкцыю існуючай вытворчасці інфузійных раствораў у шкляной тары. Сёння цэх па гэтай вытворчасці не адпавядае патрабаванням «Належнай вытворчай практыкі (GMP)». Тэхналогіі разліву і ўпакоўкі ў цэху неабходна ўдасканаліць, і мы ўжо набылі сучасны этыкетыравальны апарат, а наступным крокам будзе набыццё картанажнай машыны для аўтаматызацыі працэсу ўпакоўкі. Гэта дазволіць павялічыць вытворчасць працы і скараціць працоўныя выдаткі.

Яшчэ адна задума, здзяйсненне якой не за гарамі, — асваенне новых відаў вытворчасці, у тым ліку на аснове амінакіслот, іх сумесяў і мадыфікаваных крухмалаў. На прадпрыемстве ўжо закладзены на вывучэнне стабільнасці ўзоры раствораў гідраксіэцілкрухмалу — заменніка плазмы. Гэта сродак для аднаўлення недастатковага аб'ёму цыркуляцыі крыві. Вядзецца рэгістрацыя прэпаратаў і плануецца выпуск вопытных серый ужо сёлета. Адначасова мы асвойваем прэпараты на аснове амінакіслот і іх сумесяў. Абсталяванне на новай вытворчасці дае магчымасць нам гэта рабіць.



*Майстар змены Андрэй ГОРБАЧ кантралюе працэс прыгатавання раствораў.*



*Апаратчык аддзялення нарыхтоўкі вады Сяргей КАЛАДКО.*

**— Ці выклікала ўвядзенне новых тэхналогій кадравую праблему?**

— Так, пры наборы персаналу на новую вытворчасць мы сутыкнуліся з гэтай праблемай. Сёння мы прынялі на работу восем маладых спецыялістаў — выпускнікоў беларускіх ВНУ. Усім далі інтэрнат. Але праблема ў тым, што айчынныя ВНУ не рыхтуюць фармацэўтаў і правізараў для прамысловасці, а толькі для аптэк, і тое — з нядаўняга часу. Таму мы цэнім усіх нашых работнікаў і імкнёмся навучыць іх таму новаму, што патрабуе ад нас прагрэс у фармацэўтыцы. Часта ім неабходна змяніць не толькі дзейнасць, але і псіхалогію, стаўленне да працэсу. І гэта больш цяжка, чым авалодаць камп'ютарам і навучыцца правільна чытаць інфармацыю на маніторы. Для персаналу мы распрацавалі праграмы навучання па асноўных прынцыпах і правілах GMP, па асабістай і вытворчай гігіене, выкарыстоўванні ахоўнай вопраткі, па ахове працы і тэхніцы бяспекі.

Навучанне цяпер стаіць на першым месцы ў нашай рабоце з персаналам. Таму мы вядзём спецыяльныя журналы, завялі індывідуальныя карткі з адзнакай аб правядзенні навучання і выніках тэсціравання. Распрацавалі пісьмовыя методыкі пераапранання пры ўваходзе ў чыстыя памяшканні і выхадзе з чыстых памяшканняў, перасоўвання першапачатковай сыравіны, упаковачных матэрыялаў, гатовай прадукцыі і гэтак далей.

**— Ці задаволены вы паваротам лёсу, у выніку якога займаецеся вытворчасцю інфузійных раствораў?**

— Тое, чым я займаюся, вымагае гранічнага напружання сілаў. Не толькі, безумоўна, у мяне. Сёння гэта пачуццё добра вядома многім супрацоўнікам Нясвіжскага завода медпрэпаратаў. Аднак мэта, да якой мы імкнёмся, таго вартая.



*Начальнік цэха па вытворчасці раствораў у поліэтыленавай тары Сяргей ПАБОКА.*



*Новую самую сучасную машыну па напаўненні і запайцы поліэтыленавых бутэлек асвойваюць Раман ГАЦУРА і Сяргей БАРАВІК.*

## Наперадзе краіны ўсёй

Дзень, у які мы наведалі Нясвіжскі завод медпрэпаратаў, быў незвычайным. Напярэдадні прадпрыемства атрымала рэгістрацыю новай прадукцыі. Гэтай падзеі папярэднічала шматмесячная вялікая і карпатлівая работа, падчас якой праводзілася серыя разгорнутых аналізаў і афармляліся дакументы на ўсе складнікі новых лекавых сродкаў. Цяпер, калі на іх зацверджаны фармакапейны артыкул — нарматыўны дакумент, які ўсталёўвае патрабаванні да якасці лекаў, упакоўкі, умоў і тэрмінаў захоўвання, метадаў кантролю, прадпрыемства прыступае да выпуску пяці першых прамысловых серый для кожнага наймення лекавых сродкаў. Гэта значны, але яшчэ не апошні этап перад тым, як растворам патрапіць да спажыўца. Зноў неабходна правесці поўны цыкл аналізаў, аформіць і падаць дакументы на дазвол цяпер ужо на прамысловы выпуск. І толькі пасля атрымання такога дазволу медыцынскі прэпарат можа лічыцца таварнай прадукцыяй.

**Галоўны інжынер Наталля Маркачэўская** дасканала ведае ўсе звёны гэтага складанага ланцужка. Яна брала непасрэдны ўдзел у распрацоўцы тэхналагічнай дакументацыі для новага абсталявання, у мантажы і правядзенні пусканаладачных работ. Дзеля гэтага яна ездзіла пераймаць вопыт на фармацэўтычныя заводы ў Чыкага, Варшаву, Ольштын. Цяпер усе яе думкі пра пастаўку і мантаж другой лініі.

— Не тое, што страшна, — дзеліцца галоўны інжынер, — але не магу не думаць пра тое, як мы справімся, калі раптам машына, а ўся тэхналогія ў новым цэху камп'ютарызаваная, дасць нейкі збой. Бо з падобнымі паломкамі, як і з падобнымі машынамі, у Беларусі ніхто ніколі не меў справу. Можна сказаць, што па тэхнічным аснашчэнні завода мы апынуліся ў авангардзе краіны. Таму ў нас узнікалі праблемы з кадрамі. Здавалася б — райцэнтр — дэфіцыт працоўных месцаў, але нам былі патрэбны людзі, якія валодаюць камп'ютарам. Мы спачатку хацелі цалкам набраць маладых. Але і гэта аказалася няпроста. Моладзь цяпер хоча добра зарабляць, у яе высокія патрабаванні, а мы вымушаны ўсіх браць спачатку на стаўку вучняў, бо наша вытворчасць — спецыфічная. А значыць, і плаціць адразу вялікія грошы не атрымаецца. Тым не менш праблема вырашылася. На асноўныя этапы вытворчасці мы ўзялі маладых спецыялістаў. Сёння сярэдні заробак на заводзе — адзін з лепшых у раёне і, безумоўна, ён будзе расці.



*Апаратчык стэрылізацыі Валерый КАМЛАЧ рыхтуе бутэлькі з растворамі для тэрмічнай апрацоўкі.*

## Сэнс новага — у адпаведнасці сусветнаму ўзроўню

Наталля Маркачэўская адносіцца да той катэгорыі людзей на заводзе, якія перажылі самыя цяжкія часы ў пачатку 90-х, калі ўпершыню ўзніклі сур'ёзныя праблемы са збытам прадукцыі, былі парушаны эканамічныя сувязі паміж былымі рэспублікамі і многія прадпрыемствы аказаліся на мяжы выжывання. Тым не менш Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў правёў тэхнічнае пераўзбраенне і менавіта тады, у 1992-м, пачаў выпускаць растворы для ін'екцый. Так што трымаць нос па ветру і рызыкаваць для гэтага прадпрыемства — справа звычайная. І, відавочна, годна выходзіць са складаных сітуацый заводу дазваляе выпрабаваная часам каманда прафесіяналаў.

Мы спыталі Наталлю Маркачэўскую, ці азначае рэканструкцыя завода, што ўпакоўка ў шкляной тары — учарашні дзень фармацэўтыкі?

— Не, — патлумачыла яна, — некаторыя растворы вытрымліваюць большы тэрмін захоўвання ў шкляной тары. Таму шкляная ўпакоўка будзе заўсёды. Ва ўсім свеце больш дарагія лекі выпускаюць у шкле.

— Чаму тады ўзнікае неабходнасць пераходзіць і на поліэтылен? Можа, ён больш танны?

— Для нас ён пакуль не атрымліваецца больш танным, бо поліэтылен, з якога мы робім упакоўку, фармакапейны, створаны спецыяльна для фармацэўтыкі. На жаль, мы не знайшлі такі ў беларускіх вытворцаў і нам даводзіцца закупляць яго за мяжой. Усе павінны разумець, што якасныя лекі не могуць быць таннымі. Тым не менш пры выкарыстоўванні поліэтылену ў якасці ўпакоўкі мы эканомім на транспартных выдатках, энерганосьбітах і чалавечых рэсурсах — бо выключаецца тэхналагічная стадыя падрыхтоўкі і мыйкі гумавых коркаў, алюмініевых калпачкоў і шкляных бутэлек вадой для ін'екцый.



*Так выглядае сыравіна для вытворчасці поліэтыленавых бутэлек.*

Каб зразумець, што такое новая вытворчасць, прывяду наступныя лічбы. Адной фуры шкляных бутэлек нам хапае на адны суткі работы — гэта прыкладна 60 тысяч упаковак. Фуры пластыкавых гранул — на 1,5 месяца. На старой вытворчасці мы сёння выпускаем паўтара мільёна шкляных бутэлек у месяц, каля 18 мільёнаў у год. А ў новай, толькі пры наяўнасці першай чаргі, будзем выпускаць 5 мільёнаў поліэтыленавых бутэлек ў год. Пры запуску другой чаргі — 10 мільёнаў. Перавага тут не ў колькасці, а ў якасці, умовах працы і адпаведнасці GMP.

— Выйграём таксама на энерганосьбітах, — дадае галоўны інжынер. — Наша сістэма водападрыхтоўкі прынцыпова новая. Абсталяванне для яе паставіла вядомая нямецкая фірма, на ім выкарыстоўваюцца энергазберагальныя тэхналогіі. У старой вытворчасці мы выкарыстоўваем газ, каб атрымаць пару, з яго — першасны кандэнсат, затым — другасны кандэнсат, а ўжо з другаснага кандэнсату атрымліваем ваду для ін'екцый. Гэты спосаб называецца метадам двайной дыстыляцыі, і ён вельмі энергаёмісты.

У новай вытворчасці ў нас стаіць сістэма напрацоўкі вады. Спачатку праводзіцца абезжалезванне і змякчэнне з дапамогай акіслення паветрам. Потым вада праходзіць працэс зваротнага осмасу — гэта падзел раствораў шляхам фільтрацыі вадкасці праз паўпранікальныя мембраны, якія прапускаюць ваду і затрымліваюць гідраціраваныя іоны і малекулы арганічных злучэнняў. У выніку канцэнтраваны раствор ідзе ў адзін бок, а ачышчаная вада — у іншы. На гэта патрабуюцца нязначныя выдаткі электраэнергіі. За гадзіну мы атрымліваем 5 кубаметраў ачышчанай вады. Потым, каб атрымаць ваду для ін'екцый, выпарваем і кандэнсуем у дыстылятары толькі патрэбную нам колькасць. Гэтыя затраты энергіі не параўнальна малыя з тымі, якія патрабуюцца для «дзедаўскага» метаду двайной дыстыляцыі.

Сёння мы за кошт інавацыйнага фонду набылі ўстаноўку зваротнага осмасу магутнасцю да трох кубаметраў ачышчанай вады і для старой вытворчасці. Прыкладна палову ад патрэбнай колькасці вады мы зможам атрымліваць праз гэту сістэму і плануем скараціць выкарыстоўванне газу для вытворчасці ін'екцыйнай вады метадам дыстыляцыі. Цяпер займаемся наладкай новага абсталявання. Так што мы ўкладаем сродкі і ў мадэрнізацыю старой вытворчасці.



*Начальнік лабараторыі хімічнага аналізу аддзела тэхнічнага кантролю Святлана ДОБЫШ і хімік Кацярына КАБАНІНА.*

## Не завод — касмічны карабель

Такая асацыяцыя ўзнікла ў мяне падчас экскурсіі па новай вытворчасці. Усё выглядала нерэальным — сцены, сістэма ачысткі вады, устаноўка фірмы «WEILER», якая з пластыкавых гранул вырабляе стэрыльную аднаразовую бутэльку з медыцынскім прэпаратам, пульты кіравання вытворчым працэсам. Уразілі нават скрыні з люстэркавага металу для санітарнатэхнічнага інвентару, ракавіны на святлодыёдах для мыцця рук, шафікі для спецадзення, зоны чысціні, на якія падзелена прадпрыемства, сістэма ачысткі паветра ў памяшканнях... Падумалася: вось, беларускія кінематаграфісты яшчэ проста не ведаюць пра гэты фантастычны аб'ект, інакш мы з фільмам на пэўную тэматыку (на медыцынскую — касмічную) вырваліся б на першыя радкі сусветнага рэйтынгу. Аднак хутка ўжо, як толькі цалкам запрацуе новая вытворчасць, з'яўленне пабочных людзей тут стане немагчымым. Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў пачынае не казачны, а рэальны палёт: наперад і ўвышыню, да вяршынь сусветнай фармацэўтыкі. Што ж, першым ластаўкам можа і не проста, затое яны ведаюць адчуванне, неспазнанае для іншых.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 600031159



*Гатовая прадукцыя.*